

ДЖАНЭШ КЕЙН: «БЕЛАРУСЬ УЗМАЦНЯЕ ШАС»

5

ЯК НЕ АДКЛАДВАЦЬ НА ЗАЎТРА

13



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

17 ліпеня 2024 г.
СЕРАДА
№ 137 (30271)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

## КОРАТКА

- Рэальныя грашовыя даходы насельніцтва Рэспублікі Беларусь у студзені—маі 2024 года склалі 109,6 працэнта да ўзроўню студзеня—мая 2023 года.
- **Пасажыраабарот у першым паўгоддзі 2024 года склаў 12 079,2 млн пасажыра-кіламетраў, або 109 % да адпаведнага перыяду 2023 года.**
- Вытворчасць сельгаспрадукцыі ў гаспадарках усіх катэгорый (сельскагаспадарчых арганізацыях, сялянскіх (фермерскіх) гаспадарках, гаспадарках насельніцтва) у першым паўгоддзі 2024 года ў бягучых цэнах склала Br 11,5 млрд і павялічылася ў параўнанні з першым паўгоддзем 2023 года ў супастаўных цэнах на 10,2 працэнта.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ірына БАБАЧОНАК, намеснік дырэктара Дэпартамента па прадпрымальніцтве Міністэрства эканомікі:**

*«Да 1 кастрычніка рамеснікі, уладальнікі аграэкасядзіб і самазанятыя не лічацца суб'ектамі прадпрымальніцкай дзейнасці. Але мы заўсёды казалі, што гэта патэнцыйныя прадпрымальнікі. Цяпер, становячыся суб'ектамі прадпрымальніцкай дзейнасці, яны атрымліваюць магчымасць стаць бенефіцыярамі дзяржаўнай нефінансавай падтрымкі, калі ў іх ёсць нейкая цікавая ідэя. Цэнтры падтрымкі і інкубатары — тыя месцы, куды з 1 кастрычніка можна звярнуцца па садзейнічанне».*

ISSN 1990 — 763X

# ЛІКВІДАЦЫЯ НАСТУПСТВАЎ СТЫХІІ — НА АСАБІСТЫМ КАНТРОЛІ ПРЭЗІДЭНТА

**Кіраўнік краіны Аляксандр Лукашэнка трымае на асабістым кантролі ход аднаўленчых работ па ліквідацыі наступстваў стыхіі, якая закранула шэраг рэгіёнаў**





Фота БелТА.

**У панядзелак і аўторак фактычна да раніцы ў максімальна інтэнсіўным тэмпе пад кантролем кіраўніка дзяржавы праводзіліся ўсе неабходныя мерапрыемствы. Аб сітуацыі дэталёва ўвесь гэты час Прэзідэнту дакладвалі віцэ-прэм'ер Анатоль Сівак, старшыні Магілёўскага, Мінскага і — найбольш падрабязна — Гомельскага аблвыканкамаў. Менавіта сітуацыі ў Гомельскай вобласці, якая больш за ўсіх пацярпела ад удару стыхіі, была ўдзелена асаблівая ўвага.**

Прэзідэнтам былі дадзены неабходныя даручэнні па аператыўным устараненні наступстваў непагоды кіраўнікам шэрагу міністэрстваў і ведамстваў, а таксама першаму віцэ-прэм'еру Мікалаю Снапкову і віцэ-прэм'ерам Анатолю Сіваку і Пятру Пархомчыку. Яны ў пастаянным рэжыме былі на сувязі з кіраўніком дзяржавы з дакладамі аб ходзе работ на месцах, выкананні даручэнняў.

СТАР. 3

Па палічках

## Павялічацца дапамогі і бальнічныя

**Што мяняецца ў законах, якія рэгулююць шлюбныя і сямейныя адносіны і выплаты?**

**На мінулым тыдні былі падпісаны два законы, адзін з якіх рэгулюе сямейныя і шлюбныя адносіны, другі — устанаўлівае памер дапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей. Першы ўтрымлівае шэраг змен, якія датычацца маёмасных правоў дзяцей і парадку выплаты аліментаў, другі накіраваны на павышэнне дзяржаўных дапамог некаторым катэгорыям сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей.**



СТАР. 4

Нашы дзеці

## ПЯЦЬ ШЧАСЛІВЫХ ЗМЕН

**Канікулы ў аздараўленчых лагерах — гэта не толькі адпачынак, але і цікавыя сустрэчы**



**Самая чаканая пара года перасягнула экватар. Каляндар гартае дні з зайдроснай, з аднаго боку, і троху сумнай — з другога — хуткасцю. З пяці змен, якія прадугледжаны для аздараўлення дзяцей у гэтым годзе, дзве ўжо праляцелі, стартавала трэцяя. Але дзецям лічыць дні няма калі: вельмі вясёлым, насычаным — на конкурсы, спартыўныя спаборніцтвы, сустрэчы і іншыя цікавасці — робяць іх адпачынак дарослыя. Ды і самі яны, натхнёныя прыродай і асаблівай атмасферай, так і сыплюць рознымі ініцыятывамі. Больш таго, у дзяцей ёсць магчымасць зазірнуць у сваё заўтра ці нават вызначыцца з будучай прафесіяй — у госці да іх у рамках рэспубліканскай акцыі «Крок да поспеху» прыязджаюць розныя цікавыя асобы — знакамітыя навукоўцы, журналісты, грамадскія дзеячы, вайскоўцы, артысты і спартсмены. Аб гэтых і іншых яркіх момантах дзіцячага адпачынку — у нашым аглядзе.**

СТАР. 6

З першых вуснаў

# «Суперсучасная тэхніка без чалавека — проста жалеза»

## Пра што Галоўнакамадуючы гаварыў з найлепшымі афіцэрамі краіны

**Цырымонія ўшаноўвання выпускнікоў вышэйшых ваенных навучальных устаноў і вышэйшага афіцэрскага складу прайшла ў Палацы Незалежнасці. Па традыцыі, новыя пагоны і заслужаныя ўзнагароды афіцэрам уручае Галоўнакамандуючы — Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. Кіраўнік дзяржавы ўручыў пагоны генерал-маёра палкоўнікам Аляксандру Быкаву, Ігару Казлову, Вадзіму Сураву, Руслану Чэхаву. Палкоўніку ўнутранай службы Сяргею Саланавічу Прэзідэнт уручыў пагоны генерал-маёра ўнутранай службы. Пагоны генерал-маёра юстыцыі ўручаны палкоўніку юстыцыі Аляксею Аляшкевічу. Начальніку Гомельскай мытні Андрэю Місючэнку прысвоена персанальнае званне дзяржаўнага саветніка мытнай службы III рангу. Кіраўнік дзяржавы таксама ўручыў спецыяльныя лісты аб аб'яўленні Падзякі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь выпускнікам, якія скончылі ваенныя навучальныя ўстановы з выдатнымі паказчыкамі ў вучобе. Гэты дзень назабыўны ў іх біяграфіі, а Аляксандр Лукашэнка назваў яго асаблівым і ўрачыстым і ў жыцці краіны.**



Фота БелТА.

Вітаючы герояў дня, кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што ім выпаў вялікі гонар дасягнуць вышынь у прафесіі і кар'еры ў год 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. «Апраўдаць яго — значыць пранесці сцяг Перамогі нашых бацькоў і дзядоў праз усё сваё жыццё, перадаць яго дзецям і ўнукам», — падкрэсліў ён.

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што менавіта людзі ў пагонах у вачах мільёнаў сваіх суайчыннікаў з'яўляюцца асноўным гарантам суверэнітэту і тэрытарыяльнай цэласнасці краіны. «Што адбываецца сёння на паўднёвым і заходнім прыгранічны краіны, гаварыць не буду. Вы гэта добра ведаеце. Ведаеце гэта не горш за мяне. Па сутнасці, мы апынуліся ў той жа сітуацыі, як і нашы продкі восем дзесяцігоддзяў таму. Нам таксама трэба выдужаць, не даць магчымасці ворагам уцягнуць Беларусь у ваенны канфлікт. І мы робім для гэтага ўсё неабходнае. У тым ліку і размясціўшы ў сябе самае страшнае — ядзерную зброю», — адзначыў беларускі лідар.

Прэзідэнт заўважыў, што беларусаў папракаюць у эскалацыі і нагнятанні абстаноўкі: «А на справе мы забяспечваем ваенную бяспеку і ўмацоўваем абараназдольнасць дзяржавы. І не дапусцім паўтарэння трагедыі 41-га года. Мы і далей будзем развіваць, умацоўваць і ўдасканальваць Узброеныя Сілы. Таксама з улікам досведу баявых дзеянняў».

### Падрыхтоўцы афіцэраў будзе ўдзяляцца самая пільная ўвага

«Беларусы не хочуць вайны, але на любую правакацыю супраць нас адказ павінен быць рашучым і жорсткім. Кожны з вас гэта павінен засвоіць. Гэта наша прынцыповая пазіцыя. Ёсць каму і ёсць чым адказаць любому агрэсару, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Я заўсёды кажу, што нават суперсучасная тэхніка без чалавека — гэта проста жалеза. Таму падрыхтоўцы высокапрафесійных афіцэрскіх кадраў, сапраўдных патрыётаў, адданых краіне і народу, была і будзе ўдзяляцца самая пільная ўвага».

«Вам трэба будзе рэалізаваць тыя новыя падыходы, якія закладзены ў Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі і Ваеннай дактрыне, якія мы прынялі Усебеларускім народным сходам,» — звярнуўся ён да прысутных.

«Вы бачыце, як свет метадычна пераўтвараецца ў глабальнае поле бою. Якія толькі ні вядуцца бітвы — ментальныя, ідэалагічныя, кібер- і проксі-войны. Гэта рэальнасць, з якой трэба рабіць высновы і імгненна ўдасканальваць метады і спосабы абароны нашай краіны і вядзення вайны», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён падкрэсліў, што падзеі ва Украіне паказалі тры асноўныя метады вядзення сучаснай вайны: беспілотныя лятальныя апараты, контрбатарэйная барацьба і радыёэлектронная барацьба. Па словах кіраўніка дзяржавы, трэба вучыцца на гэтым досведзе суседзяў.

### Страляць — гэта крайні метад

«Мы за Радзіму, канешне. Але найперш павінны разумець, што за намі стаяць нашы сем'і, нашы дзеці, старыя і жанчыны — наш народ. Яны вераць у нас. Іх вера — наша сіла», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Ён заўважыў, што народ вельмі балюча і востра рэагуе на рознага кшталту напружанасці, асабліва на граніцы. І прывёў нядаўні прыклад: «Я бы не сказаў, што абвастрылася сітуацыя на беларуска-ўкраінскай граніцы, але яна выйшла за рамкі той, што была. Мы заўважылі, што ўкраінцы пачалі канцэнтраваць пэўныя войскі, у тым ліку здымаючы з фронту — самыя падрыхтаваныя баявыя войскі на прыгранічны. Мы не ўтойвалі гэта ад людзей, мы падавалі ў спакойным рэчышчы гэту інфармацыю, але людзей гэта насцярожыла, — нагадаў Прэзідэнт. — Запомніце, людзі заўсёды больш адчувальныя і яны бачаць больш, чым мы. Нам прыйшлося абяцаць людзям і рэагаваць. Усе, хто прымаў удзел у гэтым рэагаванні, заслугоўваюць самай высокай адзнакі. Я вам вельмі ўдзячны».

Галоўным досведам з гэтай сітуацыі кіраўнік дзяржавы назваў разуменне таго, што страляць — гэта крайні метад. «Гэта наш метад, мы ім павінны валодаць, але гэта крайняя мера. Трэба заўсёды вучыцца дамаўляцца, у тым ліку і ваенным», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Па яго словах, у дадзенай сітуацыі вядучую ролю адыгралі ваенныя: «Мы дыпламатаў не прыцягвалі. Але працавалі мы дыпламатычнай мовай. Дасягнулі поспеху».

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што ўкраінцам самім не трэба расцягваць фронт на паўтары тысячы кіламетраў на беларускай граніцы. Яшчэ больш канфлікт не патрэбен беларусам. Таму, як толькі ўкраінскія ўзброеныя сілы адышлі ад граніцы, беларускія войскі зрабілі тое ж самае.

«Памятайце і ведайце, што мы не хочам ваяваць. Мы будзем ваяваць толькі тады, калі чужы бот ступіць на нашу зямлю. Мы будзем рабіць усё дыпламатычным чынам, каб урэгуляваць нашы адносіны, найперш з суседзямі», — заявіў беларускі лідар. Ён падкрэсліў, што дакладна такі ж падыход і да ўрэгулявання адносін з Польшчай і Літвой. Але пакуль узаемнасці няма, таму, як заўважыў Аляксандр Лукашэнка, прыходзіцца быць пільнымі і порах трымаць сухім на паўночна-заходнім і заходнім напрамках.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

У тэму

### ЖАДАННЕ СЛУЖЫЦЬ НА КАРЫСЦЬ РАДЗІМЫ ТОЛЬКІ ЎМАЦОЎВАЛАСЯ

Пра свой шлях і свае мэты журналістам расказалі героі дня. **Руслан ЧЭХАЎ,** начальнік упраўлення ракетных войскаў і артылерыі Генеральнага штаба Узброеных сіл, якому прысвоена званне генерала-маёра, паходзіць з дынастыі ваенных. Прычым дзед скончыў службу ў званні маёра, а ўнук ужо генерал-маёр. «Шлях да гэтага звання няпросты. А новае званне — гэта яшчэ больш адказнасці. На жаль, сітуацыя вакол Беларусі застаецца складанай. І гэта накладвае пэўны адбітак на нашу баявую падрыхтоўку, на стан гатоўнасці да адбіцця агрэсіі. Ракетныя войскі і артылерыя гатовы да выканання баявых задач», — сказаў ён. Руслан Чэхаў расказаў, што ракетныя войскі сёння маюць як сучасныя ўзоры ўзбраенняў, так і мадэрнізаваныя ўзоры савецкай артылерыі. «Савецкая артылерыя добра сябе зарэкамендавала за кошт сваёй прастаты і надзейнасці. Што да сучасных узораў, то гэта вядомы наш беларускі «Паланэз» і аператыўна-тактычны ракетны комплекс «Іскандэр», які мы атрымалі ад нашых саюзнікаў з Расійскай Федэрацыі, самы сучасны комплекс, вельмі надзейны і просты ў кіраванні», — растлумачыў ён.

Падпалкоўнік **Эдуард ЖМАКІН,** намеснік камандуючага ваенна-паветраных сіл і войскамі супрацьпаветранай абароны па ідэалагічнай рабоце — начальнік упраўлення, скончыў факультэт генеральнага штаба. Ён таксама прадаўжальнік ваеннай дынастыі, які здзейсніў сваю дзіцячую мару. «У маім родным горадзе быў аэрадром і гул самалётаў мяне заварожваў. У мяне нават не было сумневаў, што я стану ваенным лётчыкам. Усё атрымалася. І з кожным годам жаданне служыць на карысць Радзімы ўва мне толькі ўмацоўвалася», — падзяліўся ён.

# «ДАЛЁКІ УСХОД ГЕАГРАФІЧНА ДАЛЁКІ, АЛЕ НЕ ЧУЖЫ»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з губернатарам Прыморскага краю Алегам Кажамякам. «Алег Мікалаевіч, Уладзівасток геаграфічна далёкі, але не чужы. Пра гэта сведчаць нашы з вамі сустрэчы нярэдкія і дамоўленасці, якіх мы дасягаем у выніку гэтых сустрэч», — сказаў беларускі лідар. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што ў Беларусі добра ведаюць магчымасці Прыморскага краю, роўна як і там ведаюць беларускія магчымасці.**

«Я часта размаўляю з Прэзідэнтам Расіі, расказваю аб нашых сустрэчах, аб патрэбах Далёкага блізкага для нас Усходу, аб просьбах губернатара Прыморскага краю. Жартам кажу: «Ён усё вывез, а калі не хапае грошай у бюджэце, выкарыстоўвае асабістыя сродкі для таго, каб працаваць на карысць Расіі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Дзякуй, што прыязджаеце да нас, адчуваеце, што недзе корань закапаны ваш у Беларусі, ад гэтага нікуды не дзенешся. Чым больш мы сталеем, тым больш нас цягне да каранёў. Мы заўсёды рады вас бачыць у Беларусі, прыязджайце».

У сваю чаргу Алег Кажамяка падкрэсліў, што для Прыморскага краю вельмі важна супрацоўніцтва з Беларуссю. «Дзякуючы нашаму супрацоўніцтву жыхары Прыморскага краю спажываюць з задавальненнем беларускую прадукцыю. І мы бачым, што з кожным годам расце абарот і па прадукцыі сельскай гаспадаркі, і па машынабудаванні. Калі мы пачыналі з паўтара мільярда (расійскіх рублёў), зараз ужо 22 з палавай мільярда. У нас і экспарт вырас у тры разы — Беларусь стала больш атрымліваць прыморскіх тавараў. І беларускія тавары карыстаюцца вялікай папулярнасцю ў нас», — сказаў ён. Губернатар падкрэсліў, што Прыморскі край штогод атрымлівае па 300-350 адзінак беларускай тэхнікі. Найбольш запатрабаваная прадукцыя Мінскага трактарнага завода і Мінскага аўтамабільнага завода.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

У тэму

### НАША ІНТЭГРАЦЫЯ НАБЫВАЕ НОВЫЯ ФАРМАТЫ

Размаўляючы з журналістамі, Алег Кажамяка падкрэсліў, што на працягу шасці гадоў Беларусь і Прыморскі край праводзяць вялікую сумесную работу, якую неабходна прадаўжаць. «Гэта ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва, і, вядома, яно часам патрабуе карэкціровак, патрабуе ўзгаднення планаў, якія дазваляюць разумець маштабы і аб'ёмы на будучыню. І вядома, патрэбны карэкціроўкі па бягучым годзе. Сустрэча з кіраўніцтвам краіны дае магчымасць бачыць перспектыву атрымання дадатковых аб'ёмаў, якія нам патрэбны. І вядома, важна ўзгадніць вялікія аб'ёмы на будучы год», — падкрэсліў ён. Губернатар заўважыў, што зараз у Прыморскім краі ідзе работа па стварэнні порта, які быў бы расійскім, і беларускім. «Думаю, што ў гэтым годзе мы вызначымся з выбарам месца, найбольш зручнага, якое валодае інфраструктурай», — распавёў Алег Кажамяка. Паводле яго слоў, сумесная работа ідзе па ўсіх кірунках. Напрыклад, спецыялісты з Прымор'я цяпер праходзяць навучанне ў беларускім інстытуце лясной гаспадаркі, беларускія выкладчыкі будуць працаваць у прыморскіх ВНУ. «Гэты абмен дасць магчымасць адкрыць сумесныя прадпрыемствы, мы ў гэтым зацікаўлены», — падкрэсліў губернатар.

Паводле слоў Алега Кажамякі, у час сустрэчы з Прэзідэнтам ён агучыў прапанову беларускаму боку прыняць удзел у рэалізацыі міжнароднага праекта «ТАР Прымор'е». Тэрыторыя апераджальнага сацыяльна-эканамічнага развіцця (ТАР) у пэўным сэнсе падобная да беларускіх СЭЗ (свабодных эканамічных зон) — тут устанаўліваецца асаблівы прававы рэжым з мэтай ажыццяўлення прадпрымальніцкай і іншых відаў дзейнасці, закліканы сфарміраваць умовы, спрыяльныя для прыцягнення інвестараў і забяспечыць развіццё сацыяльна-эканамічнай сферы паскоранымі тэмпамі.

Наладжаны моцныя культурныя сувязі — школьнікі з Прыморскага краю, якія найбольш праявілі сабе, былі заахвочаны паездкай у Беларусь. У нашай краіне яны наведалі знакавыя месцы — Курган славы, Хатынь, Буйніцкае поле. «На тэрыторыі Далёкага Усходу не было баявых дзеянняў у час Вялікай Айчыннай вайны. Таму вельмі важна паказаць нашым дзецям, што такое фашызм і да чаго ён можа прывесці, і чаму з ім трэба змагацца», — сказаў Алег Кажамяка. Таксама, паводле яго слоў, беларускія спартсмены ўдзельнічаюць ва ўсіх спаборніцтвах, якія праходзяць у Прымор'і.

«Наша інтэграцыя кожны год набывае новыя фарматы, новыя кірункі, яна развіваецца. Мы не бачым ніякіх перашкод», — падсумаваў Алег Кажамяка.

# ЛІКВІДАЦЫЯ НАСТУПСТВАЎ СТЫХІІ — НА АСАБІСТЫМ КАНТРОЛІ ПРЭЗІДЭНТА

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

Анатолю Сіваку кіраўніком дзяржавы было даручана да раніцы 16 ліпеня забяспечыць разбор завалаў, што ўтварыліся, аднавіць работу ўсёй інфраструктуры і сістэм жыццезабеспячэння насельніцтва. Раніцай 16 ліпеня — аператыўна далажыць аб сітуацыі.

Як і было даручана, у мінулыя суткі брыгады энергетыкаў, спецыялістаў лясной гаспадаркі і іншых галін былі максімальна мабілізаваны і задзейнічаны ў поўным аб'ёме, і па стане на раніцу серады віцэ-прэм'ер Анатоль Сівак далажыў Прэзідэнту аб завяршэнні асноўных работ. Выканана задача па запуску генерацыі (Мазырскай ЦЭЦ) і высакавольтных ліній, якія забяспечваюць раёны. Цяпер ідзе работа па падключэнні вытворчых і жылых аб'ектаў.

Аляксандрам Лукашэнкам таксама прынята рашэнне аб перадачы ўсяго пашкоджанага лесу ў распараджэнне кіраўнікоў абласных выканкамаў.

Прэзідэнт асабліва падкрэсліў гераічную працу тых, хто ўстараняў наступствы стыхіі, у тым ліку энергетыкаў, спецыялістаў лясной гаспадаркі, і прасіў перадаць удзячнасць усім, хто прымаў удзел у гэтай вельмі цяжкай рабоце.

**Паводле БелТА.**

❍ **У тэму**

## «ПАДОБНАЙ СІТУАЦЫІ Ў ЭНЕРГАСІСТЭМЕ НІКОЛІ НЕ БЫЛО»



Каментуючы сітуацыю ўчора, **намеснік прэм'ер-міністра Анатоль СІВАК** агучыў планы ў найбліжэйшыя суткі поўнасцю аднавіць энергазабеспячэнне ў Мазыры, які пацярпеў ад непагадзі. Паводле слоў віцэ-прэм'ера, кіраўнік дзяржавы даручыў за даволі кароткі тэрмін максімальна ліквідаваць усе наступствы, асабліва ў галіне энергазабеспячэння.

«Падобнай сітуацыі ў энергасістэме ніколі не было — мы страцілі фактычна ўсе магутнасці, якія забяспечваюць энергіяй лініі ў Мазыры і прылеглых раёнах. Вецер быў анамальна моцны, і гэта прывяло да вялікага разбурэння высакавольтных ліній. Былі парваны правады, разбураны апоры. У выніку пашкоджаныя 54 высакавольтныя лініі. У сувязі з гэтым галоўнай задачай стала даць электраэнергію і аднавіць магутнасці ў самім Мазыры», — адзначыў Анатоль Сівак.

Для таго, каб запрацавала ЦЭЦ, неабходна было даць электраэнергію, і гэту работу энергетыкі выканалі. Да сённяшняй раніцы больш за 50 працэнтаў высакавольтных ліній ужо было адноўлена, што дае магчымасць перакідаць электраэнергію ў раёны, якія маюць патрэбу. Наступны этап — перайсці на падключэнне спажыўцоў. Гэтая работа, як падкрэсліў намеснік прэм'ер-міністра, таксама павінна быць выканана за кароткі тэрмін.

Падрабязнасці

# «ЛЮДЗІ ЗРАЗУМЕЛІ, ШТО НЕ КІНУТЫЯ»

**На Гомельшчыне мабілізаваны ўсе магчымыя рэсурсы для аднаўлення інжынерных сетак, святла- і водазабеспячэння. Адказныя службы працуюць ва ўзмоцненым рэжыме, каб жыхары раёнаў, якія пацярпелі ад урагану, змаглі вярнуцца да звыклага ўкладу жыцця. Аварыйным брыгадам прыходзяць на дапамогу і неабыякавыя жыхары населеных пунктаў.**

У вобласці да раніцы 16 ліпеня падача электраэнергіі была адноўлена ў 397 населеных пунктах. На працягу дня падключэнне электрасетак удалося аднавіць у Ельску, Нароўлі і яшчэ 82 населеных пунктах рэгіёна, працягваліся работы ў Калінкавічах.

Як адзначыў падчас пасяджэння штаба па ліквідацыі наступстваў непагадзі **старшыня аблвыканкама Іван КРУПКО,** работы ў рэгіёне вядуцца кругласутачна. Ноччу на аўторак над аднаўленнем электразабеспячэння ў раёнах працавалі 32 аварыйныя брыгады.

— Каб забяспечыць бяспеку работы аварыйных брыгад, у начны час служба МНС прадаставіла светлавыя мачты. Людзі працуюць у рэжыме высокай напружанасці, таму мы абавязаны забяспечыць ім паўнацэнны адпачынак і адпаведна — змену, таму што работу спыняць ні на хвіліну нельга, — падкрэсліў на пасяджэнні штаба кіраўнік рэгіёна.

Як было адзначана, на дапамогу аварыйным службам Гомельшчыны паспяшаліся дадатковыя брыгады з Мінска, Брэста, Гродна і Віцебска. Усё робіцца для таго, каб у максімальна сціслыя тэрміны завяршыць рамонт электрасетак. Між тым у рэгіёне пасля надзвычайнага здарэння на аднаўленне электразабеспячэння былі накіраваны 131 аварыйная брыгада і 145 адзінак тэхнікі. Амаль тры дзясяткі аварыйна-выратавальных брыгад з іншых абласцей Беларусі падключыліся да ліквідацыі наступстваў стыхіі на Гомельшчыне.

З раёнаў вобласці і іншых рэгіёнаў краіны аварыйныя брыгады для дапамогі энергетыкам былі накіраваны ў Мазыр. Па даручэнні кіраўніка рэгіёна ў райцэнтры таксама створаны аператыўны штаб. Надзвычайная сітуацыя, як вядома, паўплывала ў тым ліку на работу Мазырскага нафтаперапрацоўчага завода. За сярэдзіны дня 16 ліпеня на вытворчасці былі адноўлены энергазабеспячэнне і работа тэхналагічных аб'ектаў завода. Поўнасцю аднавіць энергазабеспячэнне Мазыра плануецца ў найбліжэйшыя суткі.

— У вобласці прымаюцца максімальна магчымыя меры па паляпшэнні і аднаўленні водазабеспячэння пацярпелых ад стыхіі раёнаў, — зазначыў падчас пасяджэння аператыўнага штаба Іван Крупко.

Па даручэнні кіраўніка рэгіёна ў найбольш пацярпелых райцэнтрах вядзецца маніторынг работы гандлёвых кропак і аптэк, каб папярэдзіць магчымыя перабоі ў пастаўках прадуктаў харчавання, лекавых сродкаў.

На асаблівым кантролі губернатара — энергазабеспячэнне жыццёва важных аб'ектаў. Іх падключылі да дызель-генератарных станцый, дадаткова набылі 19 генератараў для прадпрыемстваў у дзевяці раёнах вобласці. Дызель-генератары паступілі ў гаспадаркі рэгіёна, каб забяспечыць ранішнюю дойку і работу халадзільнага абсталявання для захавання малака да моманту яго перавозкі на перапрацоўчыя прадпрыемствы. З найбольш пацярпелых раёнаў малако перамеркавана на перапрацоўчыя прадпрыемствы Гомеля, Рагачова і Акцябрскага. Падключыліся таксама перапрацоўшчыкі Брэсцкага і Магілёўскага рэгіёнаў.

Ва ўсіх лясгасах Гомельшчыны арганізаваны работы па ўборцы бураломаў на аўтамабільных дарогах, у населеных пунктах, паблізу ліній электраперадач.

Найбольш пацярпелі ад стыхіі Жлобінскі, Калінкавіцкі, Лельчыцкі і Мазырскі вопытныя лясгасы. На ўборцы бураломаў на аўтамабільных дарогах задзейнічана больш за тысячу работнікаў, у расчыстцы ліній электраперадач — звыш 200 чалавек і 76 адзінак тэхнікі.

Між тым ва ўсіх раёнах Гомельшчыны ад мясцовых жыхароў паступаюць падзякі ў адрас энергетыкаў, лесаводаў, ратавальнікаў і неабыякавых грамадзян. Так, многія жыхары населеных пунктаў у раёнах у якасці валанцёраў прыйшлі на дапамогу работнікам аварыйных брыгад. Добраахвотнікі падключыліся да дастаўкі вады і паліва ў пацярпелыя населеныя пункты, значна дапамагалі ва ўборцы распілаваных дрэў.

Па даручэнні кіраўніка вобласці, у раёнах старшыні сельвыканкамаў наведваюць усе населеныя пункты на сваіх тэрыторыях, каб вызначыць, з чым узніклі цяжкасці ў людзей. Акрамя таго ў раёнах пры сельвыканкамах сфарміраваны добраахвотныя брыгады, якія дапамагаюць у распілоўцы паваленых дрэў і рамонце домаўладанняў адзінокіх састарэлых грамадзян.

У адным з найбольш пацярпелых ад урагану Лельчыцкім раёне ў аднаўленчых работах задзейнічаны ўсе раённыя службы, а таксама дадатковыя брыгады і тэхнічныя сродкі з іншых раёнаў і абласцей. У сельскіх населеных пунктах дапамогу аказваюць і мясцовыя жыхары.

— У нас да бяды няма абыякавых. Кожны жыхар імкнецца дапамагчы. Рамантуюцца дахі, прыбіраюцца дрэвы, — распавяла старшыня Ударненскага сельвыканкама Лельчыцкага раёна Надзея Фешчанка.

— Людзі былі ў паніцы, убачыўшы, што нарабіла непагадзь. Але калі мы прыехалі, яны зразумелі, што не кінуты, што ўся неабходная дапамога для мінімізацыі наступстваў будзе ім хутка аказана, людзі супакоіліся, — падзяліўся старшыня Бараўскога сельвыканкама Лельчыцкага раёна Фёдар Юшкевіч. — У нас пацярпелі школа, дзіцячы садок. Агульнымі намаганнямі непаладкі там ужо практычна ліквідаваны. Дамоў таксама нямала пацярпела. Аказваецца дапамога адзінокім грамадзянам. Хачу выказаць словы падзякі ўсім неабыякавым вяскоўцам, якія прыйшлі на дапамогу.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС і lelchitsy.by.**









# Павялічацца дапамогі і бальнічныя

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Як адзначыла **галоўны спецыяліст упраўлення сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы Міністэрства адукацыі Алена ВАЙЦЯХОВІЧ,** па стане на 1 ліпеня больш за 23 тысячы дзяцей з 11 тысяч сем'яў знаходзіліся ў сацыяльна небяспечным стане. Аднак гэтая лічба зьмяняецца цягам года. Назіраецца станоўчая дынаміка па ўхіленні неспрыяльнай для дзяцей абстаноўкі ў такіх сем'ях. За першае паўгоддзе з ліку ўсіх дзяцей, якія знаходзіліся ў неспрыяльным становішчы, 77 % зняты з уліку ў сувязі з нармалізацыяй сітуацыі ў сям'і. А вось 13 % дзяцей прызнаны маючымі патрэбу ў дзяржаўнай абароне і адабранні ў бацькоў. Па стане на 1 ліпеня такімі прызнаны крыху больш за дзве тысячы дзяцей.

Якраз такіх сем'яў датычацца асноўныя змены Закона «Аб змяненні закона па пытаннях рэгулявання шлюбных і сямейных адносін». Пра іх расказала **начальнік упраўлення прававога рэгулявання сацыяльнай дзейнасці дзяржавы Міністэрства юстыцыі Анастасія ШОХАН,** адзначыўшы, што новы закон у першую чаргу накіраваны на імплементацыю ў законы і кодэксы норм Дэкрэта Прэзідэнта № 18, якім зараз урэгуляваны пытанні абароны дзяцей у няўдалых сем'ях.

— Нормы Дэкрэта №18 уключаны ў закон амаль без змяненняў. Такім чынам, усе прававыя падыходы, якія склаліся ў адносінах дзяцей у няўдалых сем'ях, захаваны ў законе. Толькі асобныя нормы дэкрэта зменены з улікам практыкі прымянення ці звяротаў грамадзян, якія паступаюць у дзяржорганы. Так, напрыклад, у Кодэксе аб шлюбе і сям'і ўдакладнены парадак абскарджання рашэнняў камісіі па справах непаўналетніх. У прыватнасці, законам устаноўлена, што рашэнні камісіі па справах непаўналетніх аб адабранні дзіцяці, а таксама іншыя могуць быць абскарджаны ў выканкаме, які і стварыў гэту камісію, цягам 10 рабочых дзён, а затым ужо ў судзе. Але тут важна адзначыць, што абскарджванне рашэння камісіі па справах непаўналетніх не прыпыняе яго выканання, — удакладніла Анастасія Шохан.

Акрамя таго, законам замацаваны паўнамоцтвы ўрада на ўстанаўленне адзінай формы рашэння аб адабранні дзіцяці і патрабаванняў да зместу гэтага рашэння. Раней адзінага такога дакумента, форма якога і патрабаванні да зместу былі б устаноўлены прававымі актамі, не існавала. Мяркуецца, што прыняцце такога дакумента дазволіць упарадкаваць правапрымяняльную практыку.

Закон устанаўлівае і механізм адчужэння жылых памяшканняў абавязаных асоб. Раней гэта было забаронена. Цяпер будзе дазволена адчужэнне жылых памяшканняў у такіх людзей у інтарэсах ці на карысць дзіцяці, калі на тое маецца згода органа апекі і папячыцельства (калі размова ідзе пра непаўналетняе дзіця) ці выканкама (калі грамадзянін дасягнуў паўналецця).

— Адзначу, што сёння ў мэтах абароны маёмасных правоў дзяцей устаноўлены безумоўныя забароны на адчужэнне жылых памяшканняў абавязаных асоб. Аднак практыка прымянення Дэкрэта № 18, а таксама звароты грамадзян, якія паступалі ў тым ліку ў Міністэрства юстыцыі, выявіла такія выпадкі, калі адчужэнне абавязанай асобай сваёй маёмасці як раз такі ў большай ступені будзе адпавядаць інтарэсам дзіцяці, — заявіла Анастасія Шохан. — Прывяду ў прыклад простую сітуацыю, калі ў абавязанай асобы ёсць і кватэра, і прыватны дом, але домам абавязаная асоба не карыстаецца, доўгі час у ім не пражывае, дом прыходзіць у занядпад, участак не апрацоўваецца, і мы разумеем, што калі дзіця дасягне паўналецця, пры тым, што сёння яму пяць-шэсць гадоў, то дом будзе непрыдатным для пражывання. У такіх выпадках нярэдка абавязаныя асобы выказваюць жаданне падарыць свайму дзіцяці гэты дом ці іншым чынам правесці яго адчужэнне, каб узамен набыць для дзіцяці кватэру. У такіх выпадках па новым законе органамі апекі і папячыцельства змогуць прымацца рашэнні аб згодзе на такія здзелкі ў інтарэсах дзіцяці.

Закон таксама ўдасканальвае асобныя пытанні, звязаныя з аліментамі. У прыватнасці замацоўвае магчымасць перадачы маёмасці, уключаючы жылыя памяшканні, долі ў праве ўласнасці на жылыя памяшканні, асобамі, якія абавязаны ўплачваць аліменты, ва ўласнасць дзіцяці ў лік аплаты аліментаў, у тым ліку на будучы час. Гэта будзе магчымым шляхам заключэння пагаднення аб дзецях да шлюбнага дагавора, а таксама міравога ці медыятыўнага пагаднення.

З прыняццем Закона «Аб пытаннях рэгулявання шлюбных і сямейных адносін» зменіцца парадак падыход у пастаноўцы абавязаных асоб на прафілактычны ўлік у органах унутраных спраў, паведаміў **старшы інспектар па асобых даручэннях аддзела арганізацыі работы інспекцый па справах непаўналетніх упраўлення прафілактыкі галоўнага ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі МУС Валерый АСКЕРКА.** Да ўступлення ў сілу змяненняў на ўлік у органах унутраных спраў ставяцца ўсе непрацуючыя грамадзяне, абавязаныя кампенсаваць расходы на выхаванне дзяцей, незалежна ад іх ладу жыцця. З уступленнем у сілу закона такія грамадзяне будуць ставіцца на ўлік толькі ў тым выпадку, калі будуць прыцягвацца да адміністрацыйнай адказнасці за ўхіленне ад працаўладкавання ці працы. Змяненні ўступяць у сілу з 1 студзеня 2025 года.

Уносяцца і некаторыя змяненні ў рэгістрацыю актаў грамадзянскага стану. Адна з навацый — устанаўленне абмежавання розніцы ва



ўзросце паміж бацькам і дзіцем у выпадках, калі добраахвотна ўстанаўліваецца бацькоўства ў адносінах да непаўналетняга. Так здараецца, калі жанчына, якая не знаходзіцца ў шлюбе, нараджае дзіця. Калі бацька дзіцяці хоча быць запісаны ў пасведчанне аб нараджэнні, бацькі дзіцяці могуць падаць сумесную заяву ў орган ЗАГСа.

— У такім выпадку Кодэкс аб шлюбе і сям'і будзе ўстанаўліваць абмежаванні: розніца ва ўзросце паміж бацькам і дзіцем павінна быць не менш за 15 гадоў. Да гэтага прыйшлі сыходзячы з практыкі прымянення, бо, на жаль, маюцца выпадкі, калі высвятляецца, што на момант нараджэння дзіцяці бацьку было 9 ці 10 гадоў, што з'яўляецца цалкам абсурдным. З нашага пункту гледжання, такое новаўвядзенне будзе павышаць адказнасць бацькоў за нараджэнне і выхаванне дзяцей, — патлумачыла **начальнік упраўлення натарыята і ЗАГСаў Міністэрства юстыцыі Таццяна САШЧЭКА.**

Другое змяненне — упершыню ўводзіцца ў Кодэксе аб шлюбе і сям'і дакумент, які пацвярджае адсутнасць перашкод для ўступлення ў шлюб за межамі Беларусі. Ён прызначаны выключна для рэгістрацыі шлюбу за мяжой. Цяпер такі дакумент замяняе даведка, якая выдаецца органамі ЗАГС. Змяненне таксама актуальнае з 1 студзеня 2025 года.

Адно з патрабаванняў, якое ўпершыню замацоўваецца ў Кодэксе аб шлюбе і сям'і, — неабходнасць інфармаваць органы ЗАГС Беларусі аб выпадках рэгістрацыі актаў грамадзянскага стану беларускімі грамадзянамі за межамі краіны. Калі ў кампетэнтных органах замежнай дзяржавы была ажыццёўлена рэгістрацыя шлюбу, нараджэння, смерці, грамадзяне абавязаны цягам шасці месяцаў інфармаваць органы ЗАГС Беларусі.

Што датычыцца закона «Аб змяненні законаў па пытаннях дзяржаўных дапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей», як патлумачыла **начальнік упраўлення народанасельніцтва, гендэрнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Святлана БЕЛАШ,** асноўныя змены закранулі дапамогу па цяжарнасці і родах, а таксама па часовай непрацаздольнасці па доглядзе дзіцяці. Трэці блок змяненняў адносіцца да асобных катэгорый сем'яў, у прыватнасці тых, якія выхоўваюць дзяцей з інваліднасцю.

Так, калі ў сям'і ёсць дзіця-інвалід, якое дасягнула 18-гадовага ўзросту, і яму ўстаноўлена першая група інваліднасці, а адзін з бацькоў працягвае даглядаць яго, але ў сям'і яшчэ выхоўваюцца іншыя дзеці, на якіх выплачвалася дапамога гэтак жа, як і на дзіця-інваліда, то новым законам прадугледжана захаванне права на атрыманне дапамогі на дзяцей, старэйшых за тры гады ў такіх сем'ях пасля спаўнення дзіцяці-інваліду 18 гадоў.

— Гэта значыць 50 працэнтаў бюджэту пражытачнага мінімуму на кожнае дзіця ў сям'і захоўваецца, — растлумачыла Святлана Белаш.

Акрамя таго, законам прадугледжана, што бацькі, якія ажыццяўляюць догляд за дзіцяці-інвалідам і атрымліваюць спецыяльную дапамогу, будзе прадастаўлена права і магчымасць прайсці навучанне або перанавучанне па накіраванні службы занятасці па запатрабаваных на рынку працы прафесіях. Гэта норма накіравана на сацыялізацыю такіх бацькоў і на прадстаўленне ім магчымасцяў выйсці на рынак працы, калі яны захочуць працаваць.

Змяненні датычацца і дапамог, калі бацьку дзіцяці, які выплачваў аліменты, прызвалі на тэрміновую ваенную або альтэрнатыўную службу. У гэтым выпадку выплата аліментаў прыпыняецца. Каб дадаткова падтрымаць дзіця, у такіх сітуацыях прадастаўляецца права на выплату дапамогі жанчынам, якія выхоўваюць дзяцей старэйшых за тры гады.

Закон прадугледжвае і павелічэнне дапамогі па цяжарнасці і родах, а таксама дапамогі па непрацаздольнасці па доглядзе за дзіцяці да трох гадоў з 1 студзеня 2025 года. У прыватнасці, павялічыцца мінімальны памер дапамогі па цяжарнасці і родах для працуючых жанчын, у якіх няма страхавога стажу шэсць месяцаў.

— Цяпер мінімальны памер дапамогі па цяжарнасці і родах выплачваецца кожны месяц у памеры 50 працэнтаў бюджэту пражытачнага мінімуму (БПМ), гэта каля 208 беларускіх рублёў. Законам устаноўлена, што мінімальны памер дапамогі па цяжарнасці і родах для працуючых грамадзян будзе складаць памер мінімальнай заработнай платы за кожны месяц атрымання дапамогі па цяжарнасці і родах. Сёння гэта 626 рублёў, — праінфармавала **намеснік кіраўніка ФСАН Кацярына ЛІХАЧОВА.**

Таксама навацыі закона закранулі і беспрацоўных будучых маці, якія стаяць на ўліку ў органах занятасці. Для іх дапамога па цяжарнасці і родах на сённяшні дзень складае 50 працэнтаў БПМ. На падставе навацый заканадаўства дапамога па цяжарнасці і родах будзе выплачвацца пры ўмове, што перыяд назначэння дапамогі складае не больш за шэсць месяцаў з даты звальнення, гэта значыць актуальны для тых будучых маці , якія ў перыяд звальнення былі ўжо цяжарныя. І гэтая дапамога будзе складаць 100 працэнтаў БПМ — 416 рублёў.

Павялічыцца і дапамога па доглядзе хворага дзіцяці да 14 гадоў або дзіцяці-інваліда. Сёння яна таксама складае 50 працэнтаў БПМ, але павялічыцца да 100 працэнтаў мінімальнай заработнай платы.

**Алена КРАВЕЦ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У КНДР лічаць, што міжнародная сітуацыя нагадвае становішча напярэдадні Другой сусветнай вайны



Такое меркаванне выказана ў каментарыі, апублікаваным Цэнтральным тэлеграфным агенцтвам Карэі (ЦТАК). У ім вострай крытыцы падвергся візіт прэм'ер-міністра Японіі Фуміа Кісіда ў Германію. «Цяперашняя небяспечная сітуацыя нагадвае становішча напярэдадні Другой сусветнай вайны, калі ў мінулым стагоддзі фашысцкая Германія і мілітарысцкая Японія ўтварылі ваенны альянс і прынеслі чалавецтву катастрафічныя бедствы, — лічыць ЦТАК. — Тое, што злачынныя дзяржавы, якія пацярпелі паражэнне ў сусветнай вайне, у змове праводзяць агрэсіўныя ваенныя вучэнні адно за адным, з'яўляецца сур'ёзнай акалічнасцю, якая абвастрае сітуацыю ў рэгіёне». У Пхеньяне таксама раскрытыкавалі ўдзел Кісіда ў саміце Паўночнаатлантычнага альянсу ў Вашынгтоне, падкрэсліўшы, што ў яго не было на гэта «ні найменшага права і падстаў». У Пхеньяне папярэдзілі Токіа, што «ваенная змова са знешнімі сіламі — гэта шлях да самазнішчэння». «Азіяцка-Ціхаакіянскі рэгіён не з'яўляецца плацдармам дэманстрацыі чыіх-небудзь сіл, тым больш крыжовага паходу НАТА. Няпрошаным гасцям НАТА лепш бы заняцца справай у сваім доме, а не за мяжой», — рэзюмавала ЦТАК.

### Лідар Кампартыі Непала стаў новым прэм'ер-міністрам краіны

Лідар Камуністычнай партыі Непала (аб'яднанай марксісцка-ленінскай) Кхадга Прасад Шарма Олі прызначаны новым прэм'ер-міністрам краіны, паведаміла ТАСС. Адпаведнае рашэнне прыняў непальскі прэзідэнт Рам Чандра Паўдэл. 72-гадовы Шарма Олі раней ужо двойчы займаў пасаду кіраўніка непальскага ўрада (2015—2016, 2018—2021). За апошнія 16 гадоў у Непале змянілася 13 урадаў. Кандыдатуру Шармы Олі падтрымалі 166 заканадаўцаў, у тым ліку 78 ад яго партыі і 88 ад саюзніка па кааліцыі — партыі «Непальскі кангрэс». З лідарам гэтай партыі былым прэм'ерам Бахадурам Дэўбам (2021—2022) яны дамовіліся па чарзе ўзначальваць урад да новых парламенцкіх выбараў, якія павінны адбыцца ў 2027 годзе. Згодна з канстытуцыяй, урад Шармы Олі павінен атрымаць давер парламента на працягу 30 дзён пасля прызначэння.

### У Аргенціне зафіксавана звыш паўмільёна выпадкаў захворвання на ліхаманку дэнге

У Аргенціне сёлета выяўлена звыш 520 тысяч выпадкаў інфіцыравання ліхаманкай дэнге, што больш чым утрая перавышае леташні паказчык. Пра гэта паведаміла «Сіньхуа» са спасылкай на Міністэрства аховы здароўя краіны. Па звестках Нацыянальнага эпідэміялагічнага бюлетэня міністэрства, найбольшая колькасць хворых у цэнтральным рэгіёне — 60 працэнтаў, за ім ідуць паўночна-заходні і паўночна-ўсходні рэгіёны — звыш 24 і 13 працэнтаў адпаведна. Ліхаманка выяўлена ў жыхароў 19 з 24 акруг краіны і ў гэтым сезоне стала прычынай 392 смяротных зыходаў. Цяпер узровень захворвання складае 1141 выпадак на 100 тысяч жыхароў. Сімптомы дэнге ўключаюць павышаную тэмпературу, болі ў цягліцах ці суставах, млоснасць і з'яўленне сыпу.

Джанэш КЕЙН:

# БЕЛАРУСЬ УЗМАЦНЯЕ ШАНХАЙСКУЮ АРГАНІЗАЦЫЮ СУПРАЦОЎНІЦТВА



**Дзень уступлення Беларусі ў Шанхайскую арганізацыю супрацоўніцтва (знакавая падзея адбылася 4 ліпеня) увойдзе ў гісторыю нашай краіны. Аб гэтым Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў на пасяджэнні Савета кіраўнікоў дзяржаў — членаў ШАС у Астане. «Нам ёсць што прапанаваць па канкрэтных кірунках узаемадзеяння, — заявіў Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы ў Астане ў фармаце «ШАС плюс». — У нас за спінай амаль дзесяцігадовы вопыт наглядальніка ў ШАС, устойлівыя палітычныя кантакты і эканамічныя сувязі з усімі членамі Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва». Першы форум, дзе Беларусь прысутнічала ў якасці паўнапраўнага члена арганізацыі, а Кітай праводзіў мерапрыемства ў якасці старшыні ШАС, прайшоў у партовым мегаполісе Цындаа, што ў правінцыі Шаньдун на ўсходзе Кітая. На глабальным мерапрыемстве разглядалі надзвычай важную тэму зялёнага развіцця. На пляцоўцы форуму на актуальныя пытанні адказаў намеснік генеральнага сакратара Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва Джанэш Кэйн.**

— Шчыра віншую Беларусь з уступленнем у Шанхайскую арганізацыю супрацоўніцтва. Гэта адметная падзея не толькі для вашай краіны, а і для ўсёй ШАС, — заўважыў намеснік генеральнага сакратара. — Беларусь узмацняе ШАС, цяпер у складзе арганізацыі 10 членаў. Гэта надзвычай важны крок наперад у развіцці ШАС.

***— Якая роля Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва?***

— ШАС створана з мэтай умацавання ўзаемнага даверу, дружбы і добрасуседства, пашырэння рознабаковага ўзаемадзеяння ў справе падтрымання і ўмацавання міру, бяспекі і стабільнасці ў рэгіёне, сумеснага процідзеяння новым выклікам і пагрозам, заахвочвання эфектыўнага і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва ў розных галінах, садзейнічання эканамічнаму росту, сацыяльнаму і культурнаму развіццю. Цяпер «сям'я ШАС» налічвае 26 краін: 10 дзяржаў — членаў арганізацыі, дзве краіны-назіральніцы і 14 партнёраў па дыялогу. Сумарная колькасць насельніцтва — больш за 3,5 мільярда чалавек, амаль палова насельніцтва планеты. Для параўнання маладой арганізацыі, ШАС ужо дабілася вялікіх вынікаў.

Важная роля, якую адыгрывае ШАС у міжнароднай палітычнай бяспецы, адлюстроўваецца ў шэрагу аспектаў. Сярод іх — умацаванне палітычнага ўзаемнага даверу і супрацоўніцтва ў сферы бяспекі паміж дзяржавамі-членамі на аснове «шанхайскага духу», нацэленасць на ўмацаванне рэгіянальнай бяспекі і сумеснае супрацьдзеянне такім пагрозам, як тэрарызм, сепаратызм і экстрэмізм, шляхам супрацоўніцтва ў галіне абмену разведданымі, правядзення сумесных вучэнняў і барацьбы з транснацыянальнай злачыннасцю.

ШАС актыўна наладжвае дыялог і партнёрства з іншымі міжнароднымі арганізацыямі і сумесна вырашае глабальныя праблемы. Арганізацыя адданая ідэі прасоўвання рэгіянальнага міру і стабільнасці і вырашэння міжнародных і рэгіянальных праблем з дапамогай палітыка-дыпламатычных мер. Такім чынам, яна адыгрывае важную ролю ў забеспячэнні міжнароднай палітычнай бяспекі, умацоўваючы палітычны ўзаемадавер і супрацоўніцтва ў гэтай сферы.

ШАС з'яўляецца шматбаковай і шматпрофільнай арганізацыяй, якая імкнецца палепшыць узровень жыцця грамадзян дзяржаў-членаў. У яе рамках існуюць механізмы і прававая база, якія садзейнічаюць паглыбленню супрацоўніцтва на эканамічным кірунку. Цяпер актыўна вядзецца работа па асноўных галінах эканомікі, такіх як энергетыка, транспарт, прамысловасць, фінансавая сфера, лічбавыя тэхналогіі і інш.

Эканамічнае супрацоўніцтва ў рамках ШАС не толькі садзейнічае развіццю эканомік краін-членаў, але і паглыбляе інтэграцыйныя працэсы на агульнай прасторы.

***— Якія ініцыятывы былі рэалізаваны ў апошнія гады для развіцця рэгіянальнага гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва?***

— Дзяржавы — члены ШАС прыкладаюць актыўныя намаганні для нарошчвання гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва. Штогод у рамках Савета кіраўнікоў дзяржаў — членаў ШАС, Савета кіраўнікоў урадаў, а таксама ў рамках іншых механізмаў праправоўваецца і зацвярджаецца шэраг ініцыятыў, якія садзейнічаюць эканамічнаму развіццю рэгіёна ў цэлым. Так, у ліпені мінулага года на саміце ШАС зацверджана Стратэгія эканамічнага развіцця Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва на перыяд да 2030 года, якая прадугледжвае актывізацыю супрацоўніцтва паміж дзяржавамі-членамі ў гандлёвай, эканамічнай, тэхналагічнай і фінансавай сферах, а таксама ў аспекце забеспячэння бяспекі і ўстойлівага развіцця ў рэгіёне ШАС.

Калі звярнуцца да статыстыкі, то летась тавараабарот паміж дзяржавамі — членамі ШАС склаў звыш 650 мільярдаў долараў ЗША, што на 29 працэнтаў больш, чым у 2022 годзе. Такім чынам, ШАС — важны інструмент для ўмацавання ўзаемаадносін паміж краінамі рэгіёна. Арганізацыя садзейнічае павелічэнню гандлёва-эканамічнага патэнцыялу і стварае спрыяльныя ўмовы для развіцця прадпрымальніцтва. Дзякуючы збалансаванай палітыцы, якая ўлічвае інтарэсы ўсіх членаў, ШАС паспяхова рэалізуе сваю місію — забеспячэнне міру, стабільнасці і працвітання ў рэгіёне.

***— 2024-ы аб'яўлены Годам экалогіі на прасторы арганізацыі, што падкрэслівае важнасць супрацоўніцтва па экалагічным трэку. Што робіцца ў гэтым кірунку?***

— Хачу адзначыць, што ініцыятыва, звязаная з Годам экалогіі ШАС, актуальная на фоне існуючых праблем планетарнага маштабу, звязаных са змяненнем клімату і яго згубнымі наступствамі. Асноўная яе задумка заключаецца ў прыцягненні ўвагі сусветнай супольнасці да экалагічных праблем нашай Арганізацыі, а таксама да дзейнасці ШАС у экалагічным вымярэнні. Гэта, несумненна, будзе спрыяць умацаванню прыродаахоўнага парадку дня, узмацненню яго практычных і функцыянальных асноў дзейнасці.

У ходзе пасяджэння Савета кіраўнікоў урадаў дзяржаў — членаў ШАС, якое адбылося 26 кастрычніка мінулага года ў Бішкеку, былі прыняты План мерапрыемстваў па правядзенні сёлета Года экалогіі Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва. У адпаведнасці з ім дзяржавы-члены праводзяць круглыя сталы, семінары, інтэрактыўныя гульні, экалагічныя акцыі, адукацыйныя лекцыі і іншыя мерапрыемствы, накіраваныя на папулярызацыю прыродаахоўнага парадку дня ШАС.



Сакратарыят ШАС таксама не застаецца ўбаку. Пры нашым садзейнічанні ў снежні мінулага года праведзена Маладзёжная канферэнцыя «Мадэль ШАС» на тэму «На шляху да зялёнай эканомікі: стратэгіі ўстойлівага развіцця ў рэгіёне ШАС», а сёлета ў красавіку — інтэрактыўная гульня на тэму «Глабальнае змяненне клімату». У ходзе іх студэнты і школьнікі мадэлявалі правядзенне механізмаў ШАС у сферы аховы навакольнага асяроддзя, абмеркаваўшы надзённыя праблемы і выклікі, з якімі сутыкаецца наша Арганізацыя. Гэта садзейнічала прыцягненню моладзі да вывучэння праблем міжнародных адносін сучаснасці, паглыбленню ведаў аб краінах — удзельніцах ШАС, перспектывах іх узаемадзеяння і супрацоўніцтва. На мерапрыемствы былі таксама запрошаны навуковыя супрацоўнікі з краін наглядальнікаў і партнёраў па дыялогу.

Сёлета ў лютым з нашым удзелам праведзены круглы стол на тэму «Экалагічная бяспека ў дзяржавах — членах ШАС». Абмяркоўваліся пытанні развіцця супрацоўніцтва ў прыродаахоўнай сферы, праведзены канструктыўны дыялог на тэму забеспячэння экалагічнай бяспекі, пошуку сумесных шляхоў вырашэння выклікаў і пагроз, што ўтварыліся.

Тэма пасяджэння Маладзёжнага савета ШАС сёлета таксама была прысвечана экалогіі: «Маладзёжнае лідарства ў экалагічным асяроддзі: стварэнне шляху да стабільнай будучыні ў рамках ШАС». Па яго выніках удзельнікі прынялі Сумесную рэзалюцыю па ўмацаванні супрацоўніцтва маладзёжных арганізацый краін ШАС. Дакумент прадугледжвае стварэнне міжнароднага штаба эквалан-цёраў, арганізацыю штогадовых конкурсаў экалагічных праектаў і шмат іншага.

Хачу таксама звярнуць увагу, што ў перыяд казахстанскага старшынства ў ШАС прымаліся актыўныя меры па насычэнні экалагічнага парадку дня, яго ўзбагачэнню прадуктыўным і якасным зместам. Былі прыняты такія дакументы, як «Сумесныя падыходы дзяржаў — членаў ШАС па вырашэнні экалагічных праблем», «План сумесных дзеянняў па рэалізацыі праграмы «Зялёны пояс» ШАС на 2024—2026 гады», «План мерапрыемстваў па рэалізацыі Канцэпцыі супрацоўніцтва дзяржаў — членаў ШАС у галіне аховы навакольнага асяроддзя на перыяд 2025—2027 гг.».

Нядаўна зацверджаны Пагадненне паміж урадамі дзяржаў — членаў ШАС аб супрацоўніцтве ў галіне аховы навакольнага асяроддзя, Праграма па развіцці супрацоўніцтва дзяржаў — членаў ШАС у галіне ахоўных тэрыторый (асабліва ахоўных прыродных тэрыторый, ахоўных прыродных тэрыторый) і экалагічнага турызму. Таксама кіраўнікі дзяржаў прынялі Заяву Савета кіраўнікоў дзяржаў — членаў ШАС аб эфектыўным кіраванні адходамі.

У названых дакументах адлюстраваны пытанні, звязаныя з каардынацыяй палітыкі, навукова-тэхнічным супрацоўніцтвам, адукацыяй і падрыхтоўкай кадраў, абменам інфармацыяй і вопытам, «зялёным» развіццём у сферах аховы і маніторынгу навакольнага асяроддзя, экалагічнай бяспекай, захаваннем біяразнастайнасці, змяненнем клімату, кіраваннем адходамі, энергазберажэннем і скарачэннем выкідаў. У цэлым краіны ШАС цвёрда прытрымліваюцца курсу на ўстойлівае развіццё, аддаюць вялікае значэнне тэматыцы аховы навакольнага асяроддзя, экалагічнай бяспекі і змянення клімату, рацыянальнага прыродакарыстання.

***— Што прадпрымаецца па стварэнні адзінай платформы для ўзаемаразлікаў у мясцовых валютах у краінах ШАС?***

— Краіны ШАС імкнуцца выкарыстоўваць свае нацыянальныя валюты ў гандлёвых і інвестыцыйных мэтах. Гэтае пытанне ўжо пэўны час абмяркоўваецца на розных узроўнях. З 2022 года сфарміравана экспертная група па рэалізацыі «дарожнай карты» па паэтапным павелічэнні долі нацыянальных валют ва ўзаемных разліках краін — членаў ШАС. Намаганні бакоў накіраваны на стварэнне ўмоў для функцыянавання сістэмы і стымулявання адпаведных узаемаразлікаў.

Аднак гэта складанае пытанне, якое закранае мноства розных аспектаў, у тым ліку выкарыстанне нацыянальных валют для гандлёвых разлікаў, для стымулявання інвестыцый, мноства юрыдычных пытанняў, якія неабходна пераадолець. Варта таксама ўзгадаць неабходнасць стварэння лічбавай і фінансавай інфраструктуры для рэалізацыі такой складанай сістэмы ў дзесяці розных краінах, якія маюць розныя сістэмы. Так што ў выніку нам не толькі давядзецца інтэгравацца ўсе сістэмы ў адзінае цэлае, але і сфармуляваць прававую аснову для такога гандлёвага і інвестыцыйнага рэгулявання.

Як вы ведаеце, наша Арганізацыя працуе на падставе кансэнсусу. Таму, каб дабіцца прагрэсу ў гэтым ці любым іншым пытанні, важна аб'яднаць намаганні ўсіх бакоў. Улічваючы складаны характар і вялікі маштаб гэтага пытання, яно абмяркоўваецца і прасоўваецца наперад магчыма не так імкліва, як хацелася б. Перакананы, у будучыні мы ўбачым станоўчыя вынікі.

***— Як развіваецца культурнае супрацоўніцтва?***

— Краіны ШАС незалежна ад памераў іх тэрыторый і колькасці насельніцтва на аснове захавання прынцыпаў роўнасці і ўзаемапавагі адна да адной вядуць міжкультурны і міжцывілізацыйны дыялог. Рэалізуюцца навуковыя і культурныя праекты. Аўтарытэт і ўплыў ШАС увесь час мацнее і расце дзякуючы паспяховай і адкрытай дзейнасці. Акрамя дзяржаў-назіральнікаў і партнёраў у арганізацыю да гэтага часу працягваюць паступаць заяўкі на далучэнне да шасаўскага працэсу. Правядзенне сумесных мерапрыемстваў у сферы культуры і мастацтва садзейнічае ўмацаванню ўзаемаразумення паміж народамі, захаванню разнастайнасці культур і распаўсюджванню ведаў аб культуры народаў свету. Дзяржавы — члены ШАС выступаюць за далейшае ўдасканаленне супрацоўніцтва з дзяржавамі-назіральнікамі і партнёрамі па дыялогу ШАС у галіне культуры і мастацтва як на двухбаковай, так і на шматбаковай аснове. У Стратэгіі развіцця ШАС да 2025 года адзначаецца, што дзяржавы-члены зацікаўлены ў забеспячэнні ўнутранага міжэтнічнага і міжрэлігійнага міру, ва ўмацаванні шматвяковых традыцый гарманічнага суіснавання розных народнасцей і рэлігій, у развіцці міжцывілізацыйнага дыялогу з прыцягненнем да яго дзяржаў-назіральнікаў і партнёраў.

Гнуткія схемы ўдзелу ў праектнай дзейнасці ШАС дазваляюць дзяржавам-назіральнікам і партнёрам па дыялогу падключацца да культурна-гуманітарнага супрацоўніцтва. Пры гэтым удасканальваецца механізм узаемадзеяння з дзяржавамі-назіральнікамі і партнёрамі па дыялогу ў мэтах павышэння практычнай аддачы ад узаемадзеяння, у тым ліку па гуманітарным трэку.

**Падрыхтаваў Мікалай ЛІТВІНАЎ, фота аўтара. Мінск — Цындаа — Мінск.**

# ПЯЦЬ ШЧАСЛІВЫХ ЗМЕН

### Адпачынак з тэмай

У ДУА «Аздараўленчы лагер «Арляня» Несвіжскага раёна» на першай і другой зменах аздаравілася больш як 200 дзяцей. На трэцюю і чацвёртую чакаюць да ста школьнікаў. Пятая будзе крыху меншай — на адпачынак прыедуць 60 дзяцей.

Кожная змена тут — тэматычная. Першая была прысвечана здароваму ладу жыцця, другая — экалогіі.

— У нас падабраўся цудоўны калектыў, — распавядае **дырэктар лагера Людміла ЯСЕВІЧ.** — Ініцыятыўныя важатыя, неабыякавыя педагогі. Усе мерапрыемствы рыхтуем разам. Атрымліваецца весела, дружна, пазнавальна.

Надвор'е ў Беларусі бывае і капрызным: то спякота накрые, то ўвесь дзень лье дождж. І на першы, і на другі выпадак тут ёсць умовы, каб чарговы прыродны капрыз перачакаць у камфорце. У дождж усе мерапрыемствы пераносяцца пад дах — у амфітэатр. А спякота, па словах Людмілы Мікалаеўны, пад шатамі хваёвага лесу амаль не адчуваецца.

— Прахладзіцца і паплаваць возім іх у басейн, — дадае кіраўнік лагера.

Абавязкова раз, а то і два за змену завітваюць да дзяцей госці. У «Арляня», напрыклад, прыязджала **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Алена ЖУРАЎЛЁВА.** Яна расказала



Фота аздараўленчага лагера «Хваля».

падлеткам пра свой асабісты крок да поспеху, пра тое, чым займаецца Пастаянная камісія па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, адказала на пытанні, а іх, трэба адзначыць, было нямала.

Не абышлося і без падарункаў — настольных гульняў і спартыўнага інвентару.

— Дзецям тут сапраўды хораша, — працягвае кіраўнік лагера. — Вельмі дружалюбная атмасфера. Калі закрывалі першую і другую змены, столькі слёз было... Бацькі дзякуюць, а дзеці вяртаюцца да нас ізноў. Прыязджаюць і ў трэці, і ў чацвёрты раз.

### Горад Ікігай

У аздараўленчым лагеры «Хваля» ААТ «Н холдынг» аздараўляецца каля 300 школьнікаў за змену. Сёлета іх пяць, па 18 дзён кожная.

«Фішка» гэтага лагера — рэалізацыя творчага гульнявога праекта «Горад Ікігай». Прымеркаваны ён да Года якасці. А асноўная задача для дзяцей — якасна выконваць свае мэты на дзень.

— Усе гэта праходзіць у 18 тэатралізаваных дзеях, — расказвае **намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце Анастасія ЯКУБЫШЫНА.** — Намер праекта — каб хлопчыкі і дзяўчынкі па заканчэнні ўсіх гэтых дзей зразумелі, што ўсё, што адбываецца навокал, — гэта і ёсць шчасце.

Па словах Анастасіі Уладзіміраўны, у рамках праекта праходзіць шмат цікавых мерапрыемстваў з рознымі формамі выхаваўчай работы: грамадска-патрыятычнай, гендарнай, экалагічнай — такім чынам ідзе фарміраванне маральнай культуры юнага грамадзяніна Беларусі.

— У нас нават ёсць пераходная ўзнагарода «Знак якасці», дызайн якой мы распрацавалі самі і якую дзеці — тыя, хто заслужыў, — атрымліваюць кожны дзень, — гаворыць намеснік дырэктара.

Апрача разнастайных традыцыйных дзіцячых забаў — гульняў, творчых і спартыўных конкурсаў, юныя выхаванцы «Хвалі» сустракаюць у сябе і цікавых гасцей. У рамках акцыі «Крок да поспеху» да іх прыязджаў **заслужаны дзеяч мастацтваў, акцёр Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага Сяргей КАВАЛЬЧЫК.** Дыялог, як заўважыла Анастасія Якубышына, атрымаўся жывы і непасрэдны. Дзяцей цікавіла ўсё: як стаць акцёрам, ці лёгкі гэта хлеб, што акрамя таленту патрэбна чалавеку, каб стаць паспяховым і вядомым.

### «Ювента» — гэта сям'я!

Аздараўленчы лагер назвалі імем старажытнарымскай багіні юнацтві нездарма. Бо ў гэтым месцы пануюць юнасць, задор і прыгажосць.

Адкрытая ў 2022 годзе «Ювента» ўжо здолела набыць і папулярнасць, і свайго адпачывальніка. З пачатку сезона прайшло меней чым два месяцы, а ва ўстанове адукацыі набраліся здароўя і станоўчых эмоцый ужо 217 чалавек — на першай і другой зменах. Чым былі насычаны дні дзяцей, якімі падзеямі і сустрэчамі? Расказвае **дырэктар Вольга ПЯШКО:**

— Абедзве змены былі тэматычныя. «Беларусь на далоньцы» і «Вайна і мір» — такімі былі іх назвы, і насілі яны ваенна-патрыятычны характар. Падчас другой змены нашы дзеці наведвалі воінскую часць, з імі праводзілі інтэрактыўныя мерапрыемствы МНС і РАУС. У госці да нас з прэзентацыяй фільма «Загадана жыць» прыязджалі супрацоўнікі краязнаўчага музея. А Брэсцкі абласны тэатр лялек для малодшых прывозіў дзіцячую пастаноўку.

Паміж гэтымі сур'ёзнымі пазнавальнымі мерапрыемствамі дзеці ўдзельнічалі ў спартыўных, забаўляльных і інтэлектуальных конкурсах. Ездзілі на экскурсіі і самі прымалі гасцей. За гэты час у іх пабывалі прадстаўнікі Беларускага дзяржаўнага аграрнага тэхнічнага ўніверсітэта, якія расказалі, каго і як рыхтуе іх установа адукацыі; што трэба, каб паступіць туды, і якія перспектывы чакаюць выпускнікоў ВНУ. Неўзабаве «Ювента» плануе прымаць актывістаў БРСМ.

* * *

Сёлета стартаваў ужо другі сезон рэспубліканскай інфармацыйна-асветніцкай акцыі «Крок да поспеху», якая летась на летніх канікулах атрымала гарачы водгук сярод дзяцей і падлеткаў. Асноўная мэта акцыі — выхаванне ў падрастаючага пакалення патрыятызму і пачуцця гонару за Беларусь, ведання гісторыі, а таксама фарміраванне ў дзяцей матывацыі да самаразвіцця і імкнення дасягаць поспеху.

**Алена ВІНАГРАДАВА.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

---

Годная змена

# РАЗМОВА АБ ТЫМ, ШТО ХВАЛЮЕ МОЛАДЗЬ

## Журналіст «Звязды» ў рамках рэспубліканскай інфармацыйна-адукацыйнай акцыі «Крок да поспеху» наведала аздараўленчы лагер «Чайка»

**Сустрэчы з медыйнымі асобамі, прадстаўнікамі сілавога блоку, сфер адукацыі, аховы здароўя, спорту, культуры, навукі, грамадскіх аб'яднанняў, вядучых прадпрыемстваў краіны ў летні перыяд праходзяць у выхаваўча-аздараўленчых установах адукацыі па ўсёй краіне. Супрацоўнікі Выдавецкага дома «Звязда» выступілі перад школьнікамі, якія адпачываюць у Драгічынскім, Маладзечанскім і Магілёўскім раёнах. На Магілёўшчыне, на базе аздараўленчага лагера «Чайка» філіяла «Санаторый «Чайка», адбылася сустрэча з рэдактарам аддзела палітыкі газеты «Звязда» Веранікай КАНЮТА.**



Як расказала **выконваючая абавязкі начальніка лагера «Чайка» Наталля АЎЧЫННІКАВА,** лагер працуе ўсё лета. «На гэты сезон запланавана пяць змен, у кожнай з якой — па 330 дзяцей з Магілёва і Магілёўскага раёна, — расказала яна. — У нас таксама адпачываюць выхаванцы аднаго са спартыўных клубаў Смаленска. Узрост — ад 6 да 15 гадоў. Дзеці любяць адпачываць на свежым паветры, тут добрае харчаванне, шырокая праграма, насычаная культурнымі, патрыятычнымі, адукацыйнымі, спартыўнымі і забаўляльнымі мерапрыемствамі».

Журналіст выступала перад старэйшай аўдыторыяй — хлопцамі і дзяўчатамі 14—16 гадоў, а таму палічыла спыніцца на важнасці і запатрабаванасці ў сучасным грамадстве прафесіі журналіста. Вераніка Канюта расказала і аб сваім шляху ў прафесію, цяперашнімі прафесійнымі абавязкамі. Адразу з залы пасыпаліся пытанні: дзеці цікавіліся, дзе вучыць журналістаў, што патрэбна, каб паступіць на журфак БДУ, якімі якасцямі павінен валодаць супрацоўнік медыясферы.

Вераніка Канюта расказала выхаванцам лагера аб структуры Выдавецкага дома «Звязда», выданнях, якія ўваходзяць у медыяаб'яднанне. Асобна журналіст спынілася на гісторыі газеты «Звязда», якая ў жніўні адсвяткуе сваё 107-годдзе. Дзеці пацікавіліся, ці выходзіла перыядычнае выданне ў гады Вялікай Айчыннай вайны. І з вуснаў супрацоўніцы СМІ пачулі, у якіх умовах журналісты-падпольшчыкі стваралі газету, як рызыкавалі жыццём дзеля таго, каб насельніцтва ведала праўду аб тым, што адбываецца на фронце, на акупаваных тэрыторыі.

Хлопцы і дзяўчаты задавалі самыя розныя пытанні. У сваю чаргу, выступоўца пацікавілася, з якімі прафесіямі дзеці плануюць звязаць свой лёс, як яны вучацца ў школе. Журналіст параіла ім уважліва адносіцца да ўсіх прадметаў, бо веды, якія ў гэтым узросце лічацца няважнымі, абавязкова спатрэбяцца ім у будучыні.

Напрыканцы сустрэчы школьнікі больш падрабязна распыталі пра асаблівасці журналісцкай прафесіі: дзяўчаты плануюць паступаць на журфак БДУ і хочуць паспрабаваць сябе ў якасці пазаштатных аўтараў маладзёжнага дадатку «Чырвонка. Чырвоная змена», які выходзіць на старонках «Звязды». Журналіст дала шэраг рэкамендацый, пажадала плёну ў творчасці і выказала спадзяванне, што неўзабаве ў дадатку з'явяцца новыя маладыя аўтары, а журналісцкія шэрагі папоўніць таленавітая моладзь.

Выхаванцы аздараўленчага лагера падзяліліся сваімі ўражаннямі пасля сустрэчы. Аляксандра Лепяцёнак трэці год запар прыязджае ў лагер «Чайка». Тут ёй вельмі падабаецца: сябры, новыя знаёмствы, цікавыя сустрэчы. Па словах дзяўчыны, у шэрагу апошніх — і сустрэча з рэдактарам аддзела газеты «Звязда». Аляксандра расказала, што падчас размовы з журналістам даведалася шмат новага і цікавага.

Арцём Волкаў лічыць, што сустрэчы з прадстаўнікамі розных прафесій (а ў лагеры былі і супрацоўнікі ўнутраных спраў, і ратавальнікі) вельмі пашыраюць кругагляд. «Мы пазнаём новую інфармацыю з першых вуснаў, — кажа ён. — У размове з журналістам «Звязды» мы даведаліся аб запатрабаванасці гэтай прафесіі. Быць журналістам не так і проста, як здаецца на першы погляд. Я, напрыклад, атрымліваю інфармацыю з сацыяльных сетак, і мне было карысна даведацца, што не ўсяму выкладзенаму там варта верыць, а трэба прыслухоўвацца да правераных крыніц інфармацыі».

Вераніка Цімафеева марыць быць журналістам. «У мяне добра атрымліваецца пісаць сачыненні, мне гэта падабаецца, — падзялілася дзяўчына. — Я была азнаёмлена са спецыфікай журналісцкай прафесіі, але сённяшняя сустрэча мне нават нечым дапамагла — больш даведалася аб прафесіі ад чалавека, які непасрэдна ў ёй працуе. Гэтая сустрэча, магчыма, з'яўляецца пэўным крокам да майго будучага прафесійнага выбару». Па словах Веранікі, прафесія журналіста вельмі важная. «У свеце цяпер неспакойна, і людзям патрэбна ведаць праўду, — кажа яна. — І менавіта людзі гэтай прафесіі дапамагаюць яе даносіць».

Супрацоўнікам тэлебачання бачыць сябе Сафія Цецярукова. «Рэгулярна гляджу навіны, сачу за інфармацыйнай павесткай, — падзялілася школьніца. — Сустрэча з журналістам «Звязды» была для мяне вельмі карыснай, бо я першы раз размаўляла з сапраўдным журналістам».

У сваю чаргу Вераніка Канюта звярнула ўвагу, што аўдыторыя, перад якой ёй пашчасціла выступіць, вельмі ўважлівая і дапытлівая. «Бачна, што дзеці сочаць за падзеямі, якія адбываюцца ў краіне і за яе межамі, — адзначыла журналіст. — На шчасце, не ўсе з іх атрымліваюць інфармацыю выключна з сацыяльных сетак. Некаторыя глядзяць тэлебачанне і нават чытаюць газеты, што вельмі парадавала. Параіла школьнікам звяртацца да афіцыйных крыніц інфармацыі, даверяць дзяржаўным СМІ. Прыемна, што былі ў зале людзі, якія плануюць звязаць сваё жыццё з журналістыкай. Моладзь разумее неабходнасць нашай прафесіі. У цэлым пагаварылі пра важнасць школьнага навучання, сямейныя каштоўнасці, патрыятычнае выхаванне».

**Ніка МАЙСКАЯ,**
*Магілёўскі раён.*

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
17 ліпеня 2024 г. № 26 (759)
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

АКЦЭНТЫ

# «ТЫЯ, ХТО ВЫЗНАЧАЕ БУДУЧЫНЮ КРАІНЫ»

## Аб чым Наталля КАЧАНАВА гаварыла з удзельнікамі Маладзёжнага парламенцкага форуму

**На мінулым тыдні Другі беларускі маладзёжны парламенцкі форум аб'яднаў больш як 160 маладых прадстаўнікоў розных прафесій і сфер дзейнасці з усёй краіны. Арганізатарамі форуму з'яўляюцца Маладзёжны парламент пры Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь і Маладзёжнае грамадскае аб'яднанне «Рух наперад». У праграме форуму значыліся работа тэматычных секцый, падвядзенне вынікаў нацыянальнага маладзёжнага конкурсу «Ініцыятыва лідара» і прыняцце рэзалюцыі форуму. Экспертамі і ганаровымі гасцямі форуму сталі члены Савета Рэспублікі і дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, прадстаўнікі рэспубліканскіх і мясцовых органаў улады, грамадскіх аб'яднанняў, палітычных партый, Савета маладых адвакатаў і журналістаў. У сценах Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта з удзельнікамі форуму сустрэлася Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА. На адкрытай дыялогавай пляцоўцы ва ўсіх ахвотных была ўнікальная магчымасць задаць пытанні кіраўніку Савета Рэспублікі. Ды і пытанні, якія сёння хвалююць моладзь, — важныя, дзяржаўныя. Якія фундаментальныя якасці ёсць у моладзі, што дазваляе нашай краіне развівацца і да чаго маладым людзям яшчэ трэба імкнуцца? Якія перспектывы чакаюць маладых парламентарыяў нашай краіны ў сувязі з уступленнем Беларусі ў ШАС? А таксама аб праве медыкаў на памылку і пакаранні грамадзян за неабгрунтаваныя скаргі — гэта і многае іншае абмеркавалі ў шчырай размове з Наталляй Качанавай.**



Фота БелТА.


Фота Данііла ХМЯЛЬНІЦКАГА.


Фота БелТА.

Паводле слоў Наталлі Іванаўны, адкрыты дыялог з моладдзю зарэкамендаваў сябе добра ўжо досыць даўно. «У нашай краіне ўлада працуе адкрыта. Вы бачыце, як працуе Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка, мы працуем гэтак жа. Калі мы сустракаемся з людзьмі, прычым усё роўна, будзь гэта працоўны калектыў або маладзёжная аўдыторыя, мы сумленна і адкрыта адказваем на пытанні, якія цікавяць людзей. А з моладдзю, вядома, цікава. Цяпер ідзе змена пакаленняў, мы гэта выразна адчуваем. Больш узроставыя людзі хочуць, каб побач з імі працавалі маладыя, каб перадаць ім вопыт, веды, перш за ўсё, сваё стаўленне да сваёй краіны. Таму што шанаваць усё тое, што зроблена старэйшымі пакаленнямі за больш чым 30-гадовы перыяд гісторыі суверэннай Беларусі, — вельмі важна», — адзначыла Старшыня Савета Рэспублікі. — Нам ёсць, з чым параўнаць: як людзі жывуць у іншых краінах і як жыве наш народ, якія ў нас праходзяць перaўтварэнні. Гэты год насычаны палітычнымі падзеямі. Пачаў сваю работу Усебеларускі народны сход. І, вядома, мы разумеем, што гэта вельмі важна».

Наталля Качанава прапанавала зрабіць маладзёжны парламенцкі форум традыцыйным і штогадовым. «Заўсёды з вялікай радасцю сустракаемся з моладдзю. Яны задаюць пытанні, якія іх цікавяць, і мы разумеем, дзе мы павінны больш працаваць, — заўважыла спікер. — Моладзь у нас цікавая, крэатыўная, але на іх абвальваецца велізарны паток інфармацыі. І ў гэтым вялізным патоку трэба дапамагчы ім сарыентавацца, каб вызначыць, дзе праўда, а дзе хлусня, і як трэба далей жыць, каб прыносіць карысць сваёй краіне і свайму народу».

Спікер адзначыла, што сёння больш як тры тысячы маладых людзей працуюць у маладзёжных саветах розных узроўняў. «Гэта сведчыць аб вашай грамадзянскай пазіцыі, аб стаўленні да сваёй краіны, свайго народа, аб тым, што вы думаеце, як будзе жыць і развівацца ваша краіна. І вы — людзі неабыякавыя. Гэта вельмі важна! Я заўсёды кажу: што нас можа загубіць, дык гэта абыякавасць, — падкрэсліла Наталля Качанава. — У вас ёсць унікальная магчымасць кантактаваць з кіраўнікамі мясцовых органаў улады, дэпутацкім корпусам усіх узроўняў, з кіраўнікамі дзяржорганаў кіравання. Акрамя таго, я бачу значкі дэлегата Усебеларускага народнага сходу. Значыць, вы тыя людзі, якія сёння займаюцца вызначэннем будучыні нашай краіны, стратэгічных задач, якія стаяць перад ёй».

*(Заканчэнне на 8-й стар.)*

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



# Дзеля памяці і ўдзячнасці

## Савет Рэспублікі ініцыіруе на сваёй пляцоўцы адкрытую дыскусію аб заснаванні ў Беларусі Дня партызан і падпольшчыкаў

Пра гэта гаворыцца ў каментарыі Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі Качанавай з нагоды 80-годдзя парада партызан у гонар вызвалення Мінска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў (ён адбыўся 16 ліпеня 1944 года).

«У мэтах забеспячэння пераемнасці гістарычнай памяці аб подзвігу беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны і з прычыны асаблівай ролі беларускага партызанскага і падпольнага руху ў нашай гісторыі як адной з асноў нацыянальна-дзяржаўнай ідэнтычнасці лічым мэтазгодным заснаваць у Беларусі новую знакавую дату — Дзень партызан і падпольшчыкаў», — гаворыцца ў каментарыі.

Наталля Качанава адзначыла гатоўнасць у бліжэйшы час арганізаваць на пляцоўцы Савета Рэспублікі адкрытую дыскусію, у ходзе якой будзе вызначана найбольш адпаведная гэтай падзеі дата і выпрацаваны актуальныя падыходы да ўвекавечання памяці аб удзельніках беларускага руху супраціўлення і іх укладу ў Вялікую Перамогу.

Старшыня Савета Рэспублікі падкрэсліла: 16 ліпеня — асаблівая дата ў лёсе беларусаў і ўсяго савецкага народа. «Роўна 80 гадоў таму ў Мінску адбылася знамянальная падзея — парад беларускіх партызан, сапраўдная беларуская руху супраціўлення, з нагоды вызвалення нашай сталіцы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Тады ўжо было відавочна: Вялікая Перамога блізкая і няўхільная», — адзначыла спікер.

Па словах Старшыні Савета Рэспублікі, у мужнага, гордага, няскоранага беларускага народа наперадзе была вялікая работа па аднаўленні вызваленых тэрыторый, гады найцяжэйшай працы і каласальных намаганняў па перааддоленні пасляваеннай разрухі, доўгі шлях да пабудовы суверэннай, сапраўды народнай дзяржавы. «Але ў сваіх самых светлых надзеях і марах людзі бачылі нашу краіну незалежнай, прыгожай, дагледжанай, паспяховай, камфортнай для жыцця, а галоўнае — мірнай. Такой, якая яна ёсць у нас цяпер», — падкрэсліла спікер.

«У гэтыя ліпеньскія дні мы традыцыйна ўспамінаем трагічную і гераічную гісторыю нашай краіны, аддаём даніну памяці загінуўшым, ушаноўваем ветэранаў, удзельнікаў і дзяцей Вялікай Айчыннай вайны, — сказала Наталля Качанава. — Мы ў вечным неаплатным даўгу перад старэйшымі пакаленнямі, якія неймавернай цаной адстаялі свабоду і незалежнасць Радзімы, падарылі нам права на будучыню».

«І, вядома, выказваем словы глыбокай павагі і падзякі прадстаўнікам Узброеных Сіл, органаў дзяржаўнай бяспекі, унутраных спраў, пагранічнай службы і ўсім тым, хто зараз са зброяй у руках абараняе мір і спакой, трымае на сваіх плячах чыстае неба нашай краіны, працаўнікам усіх галін і прафесій, хто аддае свой талент і ўменні на славу нашай роднай і любімай Беларусі», — дадала спікер.

Наталля Качанава таксама заўважыла, што ў кожным сапраўдным беларусе жыва адгукаюцца нятленныя радкі: «Людзі! Пакуль сэрцы б'юцца, — помніце! Якой цаной заваявана шчасце, — помніце! Дзецям сваім раскажыце пра іх, каб запомнілі! Дзецям дзяцей раскажыце, каб таксама запомнілі!» «Бо цяпер наша чарга пісаць новыя старонкі беларускай гісторыі, захоўваць і абараняць праўду аб падзеях мінулага і сучаснасці, перадаваць моладзі наша добрае стаўленне да краіны і народа», — падкрэсліла спікер.

Старшыня Савета Рэспублікі ўпэўнена, што неабходна рабіць усё магчымае і нават немагчымае, каб краіна была моцнай і станавілася яшчэ мацнейшай, паспяхова развівалася і квітнела, упэўнена займала сваё годнае месца ў новым больш справядлівым і гуманным шматпалярным свеце. «Гэта наш святы абавязак перад народам-пераможцам, перад старэйшымі пакаленнямі, перад самімі сабой. Час выбраў нас», — падкрэсліла спікер.

**Паводле прэс-службы Савета Рэспублікі.**

# «ТЫЯ, ХТО ВЫЗНАЧАЕ БУДУЧЫНЮ КРАІНЫ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

У першым скліканні Маладзёжнага савета было 70 чалавек, у другім — 138. «Гэта прадстаўнікі кожнага раёна і горада нашай краіны. І гэтыя людзі працуюць вельмі адказна. Бо ўсё на грамадскіх пачатках. Гэта ваша асабістае жаданне, ініцыятыва. І калі мы праводзім мерапрыемствы рознага ўзроўню, вы заўсёды разам з намі. Я заўсёды рада вас бачыць. Думаю, што для вас гэта добрая школа, якая патрэбна, каб разумець усе тыя працэсы, якія адбываюцца ўнутры краіны і на міжнароднай арэне, — звярнулася Наталля Качанава да моладзі. — Заўсёды цікава з вамі сустракацца, адказваць на пытанні, выслухоўваць прапановы. Ведаю, што ў гэтым форуме бяруць удзел не толькі прадстаўнікі Маладзёжнага парламента пры Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь, але і маладзёжных саветаў іншых узроўняў. Ваша работа сведчыць пра грамадзянскую пазіцыю, пра стаўленне да сваёй краіны, свайго народа, пра неабыякавасць. А правядзенне падобных форумаў, камунікат з кіраўнікамі дзяржаўных органаў кіравання, дэпутацкага корпуса дазволіць вам набрацца вопыту, атрымаць уяўленне аб тым, як узаемадзейнічаюць з органамі ўлады рознага ўзроўню на карысць сваёй краіны».

Адказваючы на пытанне, Наталля Качанава расказала, якія перспектывы чакаюць маладых парламентарыяў нашай краіны ў сувязі з уступленнем Беларусі ў ШАС. «Для нас гэта вельмі важна. Гэта дзесяць краін, якія аб'ядноўваюць вялікую колькасць людзей, што пражываюць на нашай планеце», — адзначыла спікер.

Моладзі краін ШАС трэба камунікаваць і сябраваць. «Дзе б мы ні праводзілі сустрэчы, а мы працуем шмат па міжнародным кірунку, мы ўсюды прасоўваем маладзёжны парадак дня. Мы заўсёды кажам, што маладзёжныя арганізацыі павінны супрацоўнічаць. Мы разумеем, калі вы будзеце размаўляць і сябраваць — за гэтым будучыня. Калі вы бліжэй пазнаёміцеся з моладдзю, якая пражывае ў краінах ШАС, — гэта тое, што будзе аб'ядноўваць вас. Таму праектаў для моладзі шмат, — падкрэсліла Наталля Іванаўна. — Мы будзем і ў далейшым прасоўваць маладзёжную павестку».

Старшыня Савета Рэспублікі адказала на пытанне аб праве медыкаў на памылку. «Урача трэба абараняць. У яго прафесіі кожную хвіліну сутыкаешся з небяспекай. Што самае галоўнае для чалавека? Жыццё. Урачы яго аберагаюць. У кожнай сітуацыі, па якой звяртаюцца грамадзяне па пытаннях урачэбных памылак, трэба разбірацца і даваць ацэнку. Сёння мы павінны ўкараняць інфарматызацыю ў сістэму аховы здароўя. У любым пункце нашай краіны чалавек павінен атрымаць кваліфікаваную дапамогу. Нельга займацца фармалізмам. Усе задачы ідуць ад жыцця», — падсумавала яна.



Фота БелТА.

Наталля Іванаўна расказала, як радавым грамадзянам абараняць гістарычную праўду. «Кожнаму грамадзяніну трэба рабіць сваю працу сумленна. Аб'ядноўвацца ў грамадскія аб'яднанні. А грамадскія аб'яднанні сёння могуць многае. Голас кожнага павінен гучаць праз грамадзянскую супольнасць, праз партыі. Трэба прымаць заклікі, заявы, звароты. Калі сёння не будзем гаварыць мы, то свет запоўняць фэйкі».

Заўсёды трэба быць сумленнымі, мець свой стрыжань. «Я заўсёды адстойваю тое, што ў мяне ў душы. Вы, моладзь, павінны быць такімі патрыётамі сваёй краіны, якія будуць стаяць за яе да смерці. Ніхто не ведае, што будзе заўтра. Ужо сёння адбываецца тое, што за гранню чалавечага розуму».

Дарэчы, гэты форум нясе ў сабе велізарную значнасць для моладзі, паколькі тут кожны можа праявіць сябе, запазычыць інфармацыю аб заканатворчай дзейнасці ў нашай краіне. «Мне здаецца, што кожны, хто прысутнічае на гэтым мерапрыемстве, хоча зрабіць нешта значнае для роднай Беларусі, — адзначыла **член Маладзёжнага савета Карына ТАРЛЕЦКАЯ.** — Для мяне Маладзёжны савет і «Рух наперад» — значныя, таму што хочацца стаць вельмі каштоўным чалавекам для сваёй краіны і зрабіць яе лепей, чым яна ёсць цяпер».

### Маладзёжны парламент — практыка станоўчая

«Стварэнне Маладзёжнага савета пры Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь цалкам сябе апраўдала, і гэта выходзячы нават не з нашых ацэнак, а з ацэнак тых маладых людзей, якія хочуць туды трапіць. Гэта сведчыць аб тым, што гэта эфектыўны орган, — сказала Наталля Качанава журналістам. — Маладыя людзі на працягу двух гадоў пастаянна працуюць з намі, яны прысутнічаюць на прыёмах па асабістых пытаннях, мы іх запрашаем на пасяджэнні сесій, яны ўдзельнічаюць ва ўсіх нашых мерапрыемствах».

Так, напрыклад, па словах Наталлі Качанавай, на нядаўнім Форуме рэгіёнаў вельмі добра зарэкамендавалі сябе маладзёжныя пляцоўкі. Наш Маладзёжны савет сустракаўся з маладымі парламентарыямі Расійскай Федэрацыі.

«У цэлым міжнародная дзейнасць у нашага Маладзёжнага савета досыць шырокая, — лічыць спікер Савета Рэспублікі. — Калі заканчваецца тэрмін работы ў нашых маладых людзей, а ў жніўні гэтага года ўжо будзе выбірацца новы састаў, мы даём ацэнку іх працы, зыходзячы з нашага бачання, але і, вядома, улічваем меркаванне старшыні Маладзёжнага савета, кіруючага саставу гэтага органа. Мы даём маладым людзям рэкамендацыі, якія адпраўляем губернатарам у вобласці, у Адміністрацыю Прэзідэнта. Тыя, хто сябе зарэкамендаваў, фарміруюць перспектыўны рэзерв для далейшай работы ў дзяржаўных структурах і на кіруючых пасадах».

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**

З ВЫЕЗДАМ НА МЕСЦА

# БЯСПЕКА ЛЮДЗЕЙ, ІНВЕСТПРАЕКТЫ, УБОРАЧНАЯ

## У цэнтры ўвагі сенатара Брылевіча — актуальныя пытанні парадку дня Драгічыншчыны

У ходзе рабочай паездкі па Драгічынскім раёне **член Савета Рэспублікі, старшыня Брэсцкага аблсавета Ігар БРЫЛЕВІЧ** узяў удзел у пасяджэнні райвыканкама, наведаў прадпрыемствы і сельгасарганізацыі раёна. Напрыклад, на ААТ «Экзон» прадметам размовы сталі перспектывы развіцця прадпрыемства, рэалізацыя інвестпраектаў, пашырэнне рынкаў збыту прадукцыі — паведаміла карэспандэнту газеты **начальнік аддзела ідэалагічнай работы і па справах моладзі райвыканкама Таццяна МАСЮК.**

Пасля знаёмства з вытворчасцю, сустрэч у калектыве сенатар адзначыў, што «Экзон» мае некалькі перспектыўных праектаў у плане імпартазамяшчэння, над якімі варта актыўна працаваць. Цяпер, паводле ацэнкі Ігара Брылевіча, гэтаму аддаецца асаблівае значэнне не толькі ў нашай краіне, але і ва ўсёй Саюзнай дзяржаве.

У ходзе пасяджэння Драгічынскага райвыканкама абмеркавалі меры па ўмацаванні грамадскай бяспекі, дысцыпліны, прафілактыцы злачыннасці. Гаворка зайшла таксама аб бяспецы людзей у сезон адпачынку. Сенатар звярнуў увагу ўдзельнікаў нарады на недастатковую колькасць месцаў для купання ў раёне, якія належным чынам абсталяваны. Калі такіх месцаў бракуе, людзі адпачываюць на берагах вадаёмаў у неўстаноўленых месцах і, здараецца, тонуць. Кіраўнік дэпутацкага корпуса вобласці звярнуў увагу на неабходнасць паляпшэння работы па забеспячэнні бяспекі жыццядзейнасці насельніцтва: «Няма нічога важнейшага за чалавечае жыццё. З гэтага трэба сыходзіць у тым ліку і пры абсталяванні месцаў для адпачынку», — сказаў Ігар Брылевіч.



Падчас наведвання ААТ «Экзон».



На пасяджэнні райвыканкама.

У цэнтры ўвагі сенатара таксама быў ход уборачнай кампаніі. Паводле яго слоў, ва ўмовах, калі на Брэстчыне пачалася масавая ўборка збожжавых, задачай дэпутацкага корпуса становіцца кантроль за тым, ці створаны належныя ўмовы для работы людзей. Апошняе і з'яўляецца адной з гарантый таго, што ураджай, які вырашчаны, будзе сабраны ў аптымальныя тэрміны і якасна захаваны.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

**Фота Драгічынскага райвыканкама.**

# Нефармальна, але патрыятычна

## Першы дэпутацкі турзлёт, прысвечаны 80-годдзю вызвалення Беларусі, прайшоў у Воранаўскім раёне

**У ім прынялі ўдзел прадстаўнікі Саветаў усіх узроўняў Гродзенскай вобласці — члены Савета Рэспублікі, дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, а таксама абласнога, раённага, сельскіх Саветаў, Маладзёжнага парламента.**






### Турзлёт як форма кансалідацыі

Упершыню народныя выбраннікі правялі пашыранае выязное пасяджэнне камісіі па сацыяльнай палітыцы Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў у фармаце турыстычнага злёту. Чым абумоўлена такая ідэя?

—Такі фармат не стаў нечым спантанным, — расказала **старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў Алена ПАСЮТА.** — Ён абумоўлены ўсім ходам работы нашага дэпутацкага корпуса. Чаму? Бо, як і ва ўсім грамадстве, тут важная ідэя кансалідацыі. Трэба падкрэсліць, што пасля адзінага дня галасавання склад дэпутацкага корпуса аднавіўся амаль на 80 працэнтаў. Правядзенне нефармальнай сустрэчы было прадыктавана самім жыццём. Мы вырашылі замацаваць нашу сумесную работу такім чынам, каб гэта было і душэўна, і, разам з тым, прадукцыйна. Таму ў рамках выязнога пасяджэння камісіі па сацыяльнай і маладзёжнай палітыцы было прынята рашэнне правесці такое мерапрыемства, якое дазволіць не толькі пазнаёміцца паміж сабой, але і абмеркаваць ролю органаў мясцовага самакіравання ў развіцці сваёй тэрыторыі. Ідэя турыстычнага злёту падалася найбольш прыдатнай. Разам з тым, пры ўсёй насычанасці і разнастайнасці праграмы, на першым плане была асоба дэпутата.

Як паведаміла суразмоўца, тут не адмовіліся ад традыцыйнага падыходу да мерапрыемства. Маюцца на ўвазе турыстычныя спаборніцтвы, віктарыны, канцэртныя нумары, вогнішча. Усё гэта таксама прысутнічала. Але акцэнт быў зроблены на абмеркаванні важных для грамадства пытанняў. Чырвонай стужкай прайшла тэма 80-годдзя вызвалення Беларусі. Яна была ўвасоблена і ў інтэлектуальнай гульні-батле «Ведай Беларусь», і ў дыялогавай пляцоўцы «80 мірных гадоў. Доўгі шлях да вызвалення». Дарэчы, падчас дыспуту разглядаліся пытанні генацыду беларускага народа, ўвекавечвання памяці абаронцаў у рэгіёнах, выказваліся прапановы па далейшым развіцці пераемнасці пакаленняў. Спікеры выступілі па пытаннях ролі мясцовага кіравання і самакіравання ў захаванні гістарычнай памяці аб Вялікай Перамозе, недапушчэнні фальсіфікацыі вынікаў Вялікай Айчыннай вайны, ідэйнай кансалідацыі грамадства, ролі УНС. Былі ўзгаданы дэпутаты — героі Вялікай Айчыннай вайны. І сёння на народных выбраннікаў ускладаецца вялікая адказнасць.

### Аб'яднаць раёны і людзей

Яшчэ адным важным блокам дыялогавай пляцоўкі стала знамянальная дата — 30-годдзе інстытута прэзідэнцтва. Узгадваліся падзеі пачатку дадзенай кампаніі, якая паступова вызначыла новы, прагрэсіўны рух краіны. І сёння дэпутаты павінны рабіць усё магчымае, каб згуртаваць грамадства. Іх звароты, інфармаванне насельніцтва — гэта той падыход, які робіць грамадства маналітным. Таксама новым народным выбраннікам важна было паказаць важнасць асобы дэпутата ў рашэнні надзённых пытанняў у сваіх акругах.

— Упершыню мы праводзім падобнае маштабнае мерапрыемства ў такім незвычайным фармаце. Такі падыход важны і для дэпутацкага корпуса, бо ад яго таксама многае залежыць. Таму вырашылі паразмаўляць на розныя актуальныя тэмы і сумясціць турыстычны фармат і патрыятычны, — удакладніла Алена Пасюта. — Мы павінны аб'яднацца. Усё гэта садзейнічае таму, каб у краіне быў мір, дабрабыт, дакладнае разуменне таго, што ад кожнага залежыць будучыня Беларусі.

Дэпутаты маглі даведацца аб рабоце на розных узроўнях. Напрыклад, што ў кампетэнцыі дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, якія заканадаўчыя акты зараз прымаюцца сенатарамі, якія пытанні абмяркоўваліся і будуць вырашацца ў абласным Савеце, якія цікавыя формы работы выкарыстоўваюць нашы маладыя парламентарыі. Важнай, па словах лідара абласнога дэпутацкага корпуса, стала магчымасць аб'яднаць раёны паміж сабой, каб яны навучыліся дамаўляцца. І не толькі падчас правядзення турыстычнага злёту.

> «Мэта турзлёту якраз і была накіравана на тое, каб захаваць гістарычную памяць, паказаць ролю дэпутацкага корпуса ў гэтым працэсе. Таксама тут ёсць і другі бок — папулярызацыя здаровага ладу жыцця, турыстычных навыкаў, развіццё камунікацый, папросту кажучы, з'явілася такая магчымасць сабраць дэпутатаў усіх узроўняў».



Воранаўскі раён быў выбраны невыпадкова. Як зазначыла **старшыня Воранаўскага райсавета Алена ГАНЕВІЧ**, тут падрыхтавана адпаведная лакацыя, у раёне ёсць вопыт правядзення турыстычных мерапрыемстваў. Таму было прынята рашэнне правесці дэпутацкі выязны злёт у аграгарадку Пагараны. Месца знакавае. Сядзібна-паркавая зона мае статус гісторыка-культурнай спадчыны XVIII стагоддзя, таксама тут устаноўлены памятны знак у гонар дзяўчат-сувязістак, якія былі расстраляны немцамі ў гэтых мясцінах.

— Мэта турзлёту якраз і была накіравана на тое, каб захаваць гістарычную памяць, паказаць ролю дэпутацкага корпуса ў гэтым працэсе. Таксама тут ёсць і другі бок — папулярызацыя здаровага ладу жыцця, турыстычных навыкаў, развіццё камунікацый, папросту кажучы, з'явілася такая магчымасць сабраць дэпутатаў усіх узроўняў. Мы фарміравалі каманды па прынцыпе прыналежнасці да выбарчай акругі. Таксама была прадумана праграма злёту. Зрабілі банер, устанавілі ваенна-вызваленчую рэканструкцыю, сіламі вайсковай часці былі прадстаўлены паказальныя выступленні. Мы ўбачылі, што нас ахоўваюць сапраўдныя абаронцы краіны, — зазначыла Алена Ганевіч.

Інтэлектуальны конкурс праходзіў у выглядзе бліц-апытання на тэму ведання гісторыі сваёй краіны. А конкурс ваенна-патрыятычнай песні ля вогнішча стаў адным з самых памятных момантаў. Кожная каманда прадставіла сваю кампазіцыю і інсцэніроўку. Гэта яшчэ больш аб'яднала ўдзельнікаў дэпутацкага турзлёту.

### Тон зададзены, працяг будзе

Напачатку ідэя з турзлётам успрымалася даволі іранічна: маўляў, што гэта за выязное пасяджэнне ля вогнішча ў лясным масіве? Усе прадстаўлялі турыстычны злёт у больш звыклым варыянце. А тут такая насычаная, змястоўная праграма. Усе атрымалі зарад патрыятызму і упэўніліся, што, калі мы разам, мы сапраўды вялікая сіла. А такая кансалідацыя дазваляе вырашаць многія задачы.

— Думаю, мы даволі гучна заявілі аб дэпутацкім корпусе Гродзеншчыны. Падобнага роду фармат будзе працягвацца і надалей, мы перадалі эстафету Навагрудскаму раёну, дзе падобнае мерапрыемства павінна адбыцца ў наступным годзе, калі мы будзем святкаваць 80-годдзе Вялікай Перамогі, — адзначыла Алена Ганевіч. — Тон зададзены. Вызначаны новы фармат узаемадзеяння дэпутатаў розных узроўняў, багаты змест, да якога, дарэчы, далучыліся і мясцовыя жыхары аграгарадка. Яны таксама ў нейкай ступені сталі ўдзельнікамі злёту.

Важным момантам, па словах Алены Ганевіч, з'яўляецца станоўчае пазіцыяніраванне сельскіх тэрыторый. Фарміруецца пазітыўны імідж сельскіх населеных пунктаў. Напрыклад, дзякуючы дэпутацкаму турзлёту аграрарадок атрымае большую вядомасць.

Таксама была ўзнята тэма ўплыву СМІ у захаванні гістарычнай памяці, роля блогераў у фарміраванні свядомасці беларусаў, важнасць патрыятычнага выхавання насельніцтва праз асабісты ўдзел. Адной з тэм турзлёту стала развіццё камунікацый і фарміраванне дэпутацкай этыкі паміж усімі ўзроўнямі дэпутацкага корпуса Гродзенскай вобласці.

У далейшым мяркуецца такую аснову захаваць. Падобныя дэпутацкія выязныя форумы будуць праводзіцца ў розных раёнах вобласці. Будзе пашырацца змест. З Гродзенскім дзяржуніверсітэтам цяпер распрацоўваецца тэма даследчых работ, якія прысвечаны развіццю парламентарызму.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

**Фота абласнога Савета дэпутатаў.**

# Дарогі, пляцоўкі і добраўпарадкаванне:

## Якія пытанні вырашае калегіяльны орган тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання

**З кожным годам з'яўляецца ўсё больш неабыякавых людзей, якія хочуць бачыць свой двор дагледжаным, пад'езд — чыстым, а лавачкі — пафарбаванымі. Калі вышэйсказанае — пра вас, паспрабуйце свае сілы ў калегіяльным органе тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання (КОТГС). Не трэба палохацца мудрагелістай назвы, усё вельмі проста. Так афіцыйна называецца група людзей, якія неабыякава ставяцца да жыцця свайго раёна і ўсімі сіламі спрабуюць палепшыць навакольную тэрыторыю. Падрабязней аб тым, чым сёння жыве такая грамадская ініцыятыва, карэспандэнты «Звязды» даведаліся ў КОТГС № 120 Кастрычніцкага раёна сталіцы.**

Галоўная задача калегіяльнага органа тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання — быць злучальным звяном паміж насельніцтвам раёна і адміністрацыяй, ЖКГ, МУС, МНС, установамі адукацыі. Акрамя гэтага, прадстаўнікі органа самакіравання ў абавязковым парадку ўдзельнічаюць ва ўсіх рэспубліканскіх акцыях, суботніках і іншых культурна-масавых мерапрыемствах.

«Сёння мы стараемся падтрымліваць у добрым, спраўным стане спартыўную пляцоўку на вуліцы Асаналіева ў двары дома № 9, — распавяла **сакратар калегіяльнага органа тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання № 120 Яўгенія АЛЯКСЕЕВА.** — Калі нешта прыходзіць у непрыдатнасць, неадкладна рэагуем і выпраўляем пашкоджанні. Вельмі ўдзячныя ЖКГ Кастрычніцкага раёна горада Мінска. Іх супрацоўнікі ў цесным кантакце з намі. Яны заўсёды адгукаюцца на просьбы аб дапамозе і падтрымліваюць нас. Спартыўная пляцоўка — аблюбаваная лакацыя не толькі для дзяцей, але і для дарослых. Пажылыя людзі, вяртаючыся з крамы, любяць пасядзець на лаўцы ў цені, асабліва спякотным летам, і пагутарыць».

КОТГСы рэгулярна ўдзельнічаюць у штогадовым раённым і гарадскім аглядзе-конкурсе на лепшую арганізацыю работы, ажыццяўляюць зваротную сувязь з насельніцтвам, прыцягваючы жыхароў мікрараёнаў да ўдзелу ў работах па добраўпарадкаванні тэрыторый. Ва ўзаемадзеянні з раённай адміністрацыяй і службамі раёна яны ўдзельнічаюць у культурна-масавых, спартыўных мерапрыемствах, а таксама ў рабоце з моладдзю. Прадстаўнікі калегіяльнага органа тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання № 120 штомесяц удзельнічаюць у савеце грамадскага пункта аховы правапарадку, працуюць з цяжкімі падлеткамі і праблемнымі сем'ямі, прымаюць актыўны ўдзел у рэспубліканскіх і дадатковых суботніках, працуюць са зваротамі грамадзян. Праз уласны тэлеграм-канал інфармуюць жыхароў раёна аб мерапрыемствах.



Сакратар КОТГС Яўгенія АЛЯКСЕЕВА.

Дарэчы, часта ад сем'яў раёна паступаюць просьбы ўладкаваць на спартыўнай пляцоўцы невялікае футбольнае поле, усталяваць вароты для гульні ў міні-футбол. «Тут недалёка ёсць школа з вялікім стадыёнам, але дзеці баяцца самі туды хадзіць. На гэтай пляцоўцы, якая знаходзіцца прама перад іх домам, дзецям нашмат камфортней. Уся атрыманая інфармацыя была перададзена ў неабходныя інстанцыі. Наш калегіяльны орган тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання трымае вырашэнне кожнага пытання на кантролі. Мы стараемся пачуць усіх і дапамагчы кожнаму. Вядома, не заўсёды ёсць магчымасць выканаць просьбу аператыўна. Таму калі не адразу, то крыху пазней абавязкова рэалізуем тое, што абяцалі зрабіць», — запэўніла Яўгенія Аляксеева.

Паводле яе слоў, на тэрыторыі калегіяльнага органа тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання ёсць падшэфны яслі-сад, які наведваюць самыя маленькія мінчане. Але вось незадача — на ўваходзе ў дашкольную ўстанову разбіты асфальт. «З пытаннем рамонту дарогі да нас звярнулася загадчыца яслі-сада. Бруд, перамяшаны з кавалкамі асфальту, прычыняў шмат нязручнасцяў для дзяцей, іх бацькоў і супрацоўнікаў установы. Мы звярнуліся ў ДАІ Кастрычніцкага раёна — як вынік — за чатыры дні тут праклалі новы асфальт. Акрамя таго, нашымі сумеснымі намаганнямі быў пракладзены бяспечны падыход да мясцовай школы — раней школьнікі былі вымушаныя дабірацца да ўстановы адукацыі па праезнай частцы. Прыйшлося нямала папрацаваць, аднак цяпер дарога дзяцей па веды — бяспечная», — заключыла сакратар.

Такім чынам, калегіяльны орган тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання — гэта звычайныя людзі, нашы з вамі суседзі, якія неабыякавыя да жыцця свайго раёна. Яны ўсімі сіламі спрабуюць палепшыць навакольную тэрыторыю. Акрамя таго, яны садзейнічаюць праваахоўным органам у прафілактыцы правапарушэнняў і падтрыманні грамадскага правапарадку, удзельнічаюць у вырашэнні пытанняў, звязаных з сацыяльным абслугоўваннем насельніцтва адпаведнай тэрыторыі, праводзяць культурныя, спартыўныя, адукацыйныя і іншыя мерапрыемствы для жыхароў раёна, хадайнічаюць аб заахвочванні актыўных грамадзян, якія ўносяць вялікі асабісты ўклад у развіццё грамадскага самакіравання, ажыццяўляюць іншыя паўнамоцтвы ў адпаведнасці са Статутам горада Мінска, якія не супярэчаць дзеючаму заканадаўству нашай краіны.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

ДОБРАЯ СПРАВА

# ДВОРЫК, ДЗЕ ЎТУЛЬНА ЎСІМ

**Нядаўна папулярная ў дзяцей гульнявая пляцоўка пад назвай «Маскоўскі дворык» па вуліцы Якубоўскага, 51 у Магілёве стала больш маштабнай і функцыянальнай. Тут размясціліся дадатковыя вулічныя атракцыёны і трэнажоры, з'явіліся валейбольная і футбольная пляцоўкі. Цяпер гэта сучасная гульнявая і спартыўная зона, дзе ёсць магчымасць пазаймацца фізкультурай нават дарослым. Урачыстае адкрыццё адбылося з удзелам прадстаўнікоў кіраўніцтва мясцовай улады і дэпутатаў.**

Адкрываючы мерапрыемства, **першы намеснік старшыні Магілёўскага гарвыканкама Ігар БУШЛЯКОЎ** адзначыў, што ўжо не першы год у Магілёве добраўпарадкоўваюцца дваровыя тэрыторыі, ствараюцца новыя дзіцячыя пляцоўкі.

— Чарговы падобны аб'ект у Ленінскім раёне разлічаны на дзяцей усіх узростаў, — падкрэсліў ён падчас адкрыцця. — Гэта адзін з прыкладаў таго, што гарвыканкам і аблвыканкам прыкладаюць усе намаганні, каб магілёўчанам жылося камфортна. Такія пляцоўкі ствараюць умовы для карыснага адпачынку дзяцей і іх бацькоў. Інвестуючы ў добраўпарадкаванне нашых мікразон, дзяржава ўкладае грошы ў будучыню нашых дзяцей.

— Жыхары атрымалі проста шыкоўны падарунак, — падзялілася эмоцыямі **дэпутат Магілёўскага абласавета Вольга КАВАЛЁВА.** — Гэта мікрараён, дзе я нарадзілася і вырасла. Тут жыве мая сям'я, суседзі, выбаршчыкі, якія аддалі свае галасы за мяне. Я вылучалася ў народныя выбраннікі менавіта па гэтай, Арлоўскай выбарчай акрузе № 32. І мне вельмі важна, каб тут было ўтульна і прыгожа. Нядаўна адкрывалі гульнявую пляцоўку непадалёк — на вуліцы Арлоўскага. У нас наогул вельмі ўтульна і прыгожа. Я лічу, што наш мікрараён Мір-2 — самы лепшы ў горадзе. Тут знаходзіцца і прадпрыемства «Водаканал», дзе я працую, грамадскі пункт аховы правапарадку, старшынёй якога я з'яўляюся. Без перабольшання магу сказаць, што ведаю, чым дыхае гэта мікразона, якія людзі тут жывуць, што для іх важна. Хацелася ўнесці лепту ў гэтае свята. Звярнулася да кіраўніцтва прадпрыемстваў, дзе працую, і папрасіла дапамагчы з упрыгожваннем пляцоўкі. Мне пайшлі насустрач, і набылі ўсё неабходнае. Атрымалася вельмі святочна.

Пляцоўка знаходзіцца ў цэнтры мікразоны, дзе шмат дзіцячых устаноў. Побач гімназія № 2, тры дзіцячых садка. Тут любяць адпачываць сем'ямі. І на свята прыйшло шмат людзей. Прыемным сюрпрызам стала вясёлая забаўляльная праграма з канцэртнымі нумарамі, роставымі лялькамі, конкурсамі і гульнямі. Музычныя нумары падрыхтавалі выхаванцы цэнтра творчасці дзяцей і моладзі «Агат», дзіцячых садкоў № 62 і № 69, навучэнцы гімназіі № 2 і Магілёўскага дзяржаўнага электратэхнічнага каледжа. Працавалі лакацыі ад БРСМ, МНС, Ленінскага (г. Магілёва) аддзела Дэпартамента аховы, а булачна-кандытарскае прадпрыемства «Дамачай» арганізавала дэгустацыю сваіх прысмакаў. Захапленне ва ўсіх без выключэння выклікаў чатырохногі напарнік міліцыянера-кінолага групы затрымання Віталя Севярынцава Ітэн-Грэй, які бліскуча выконваў усе каманды свайго гаспадара.

Школьнікі адразу ж ацанілі магчымасці спартыўных пляцовак. На футбольным полі пад адабраючыя воклічы мясцовых заўзятараў прайшоў першы футбольны матч. «Не пляцоўка, а фантастыка», — прызналіся юныя футбалісты.

А вось дэпутаты нават на святах не разнявольваюцца. Вольга Віктараўна, карыстаючыся момантам, перагаварыла з начальнікам ЖЭУ наконт звароту жыльцоў дома, падвал якога падтапіла камунальнымі сцёкамі. Дэпутат кажа, што часта даводзіцца вырашаць пытанні добраўпарадкавання, жыллёва-камунальнага характару. І вельмі часта дастаткова зрабіць толькі адзін званок. Вольга Кавалёва стала дэпутатам упершыню, але, як заўважае, усё жыццё займалася грамадскай работай. Ёй падабаецца дапамагаць людзям і, як лічыць, гэта ў яе атрымліваецца. Прыходзілася працаваць і з цяжкімі падлеткамі, і з праблемнымі сем'ямі, і з аматарамі выпіць . А гэта дзейнасць, на першы погляд, магчыма, і не зусім удзячная, а усё ж прыносіць плён.



Фота Дар'і ЭВЕРС.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.**

**www.zviazda.by**

e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 311 17 35;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 03.04.2004. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.**

**Тыраж 12.118. Нумар падпісаны ў 19.30 16 ліпеня 2024 года.**

Даты

# ТРЫУМФ ПАРТЫЗАН-ПЕРАМОЖЦАЎ

**...Такіх вось парадаў гісторыя не ведала: 80 гадоў таму, 16 ліпеня 1944 года, у вызваленым Мінску адбылося ўрачыстае шэсце партызанскіх злучэнняў.**



Начальнік Беларускага штаба партызанскага руху П. З. Калінін у кнізе «Партызанская рэспубліка» пісаў, што напярэдадні, 14 ліпеня, адбылося пасяджэнне бюро ЦК КП(б)Б, што месцам для парада быў выбраны былы гарадскі іпадром у выгібе ракі Свіслач, што тэрыторыя была старанна праверана мінёрамі.

Назаўтра ў горад і яго ваколіцы прыбылі 30 партызанскіх брыгад і два асобна дзейныя атрады агульнай колькасцю 30 тысяч чалавек, адбылася першая рэпетыцыя. Шэсцю папярэднічаў мітынг з удзелам кіраўнікоў рэспублікі, камандзіраў партызанскіх злучэнняў і часцей, дэлегацыя воінаў Чырвонай Арміі на чале з камандуючым 3-м Беларускім фронтам генералам І. Д. Чарняхоўскім.

Першы сакратар ЦК КП(б)Б, старшыня Саўнаркама БССР, начальнік Цэнтральнага штаба партызанскага руху П. К. Панамарэнка павіншаваў усіх прысутных, выказаў падзяку байцам, афіцэрам і генералам Чырвонай Арміі — вызваліцельніцы Савецкай Беларусі, яе партызанам і партызанкам.

...На парад яны, вядома ж, «прыбраліся» — і хто ў што: абтрапаныя цывільныя пінжакі, падпяразаныя патранташамі гімнасцёркі, трафейныя нямецкія кіцелі; на шапках, пілотках, фуражках нашытыя пунсовыя стужкі (адрозны знак партызан), у многіх — армейскія зоркі.

Са зброі таксама што ў каго: айчынныя трохлінейкі і аўтаматы ППШ, трафейныя вінтоўкі і аўтаматы. Хіба ўзнагароды зіхацелі ва ўсіх аднолькава — эмаллю, серабром і золатам. Ды твары — худыя, змардаваныя — ззялі радасцю. Гучалі песні і маршы. Развяваліся пунсовыя сцягі.

Гонар адкрыць парад быў аказаны партызанскай брыгадзе «Народныя мсціўцы» імя В. Т. Варанянскага (камандзір — Герой Савецкага Саюза Р. Ф. Пакроўскі), якая за тры гады ў тыле ворага пусціла пад адхон 161 эшалон з жывой сілай і баявой тэхнікай, тры бронецягнікі, разграміла 20 варожых гарнізонаў і знішчыла больш чым 11 тысяч гітлераўскіх салдат, звыш 1,5 тысячы ўзяла ў палон.

...Партызаны, якія не прывыклі, ды і не ўмелі хадзіць строем (не было дзе вучыцца), між тым трымалі рады, чаканілі крок. Завяршала парад калона партызанскіх коннікаў з больш як тысячы чалавек.

...Усе цэнтральныя газеты абышоў тады фотаздымак з казлом. Ён з'явіўся ў атрадзе «Барацьба» брыгады «Народныя мсціўцы» восенню 1943-га, калі партызаны разграмілі нямецкі гарнізон на станцыі Куранец Вілейскай вобласці. У якасці трафеяў дасталіся зброя, боепрыпасы, аўтамабілі, матацыклы, рыштунак і... казёл, якога партызаны паставілі на забеспячэнне, прычым — не задарма: Малыш пад агнём хадзіў за санінструктарам — нёс сумку з медыкаментамі, на танку, па словах партызан, уязджаў у вызваленую ад немцаў Вілейку. Іншымі словамі, заслужыў права прысутнічаць на парадзе: са стужкай з нямецкімі ўзнагародамі ён заняў сваё месца наперадзе калоны.

...У музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны экспануецца карціна народнага мастака Беларусі, франтавіка Я. А. Зайцава «Парад партызан у г. Мінску». У экспазіцыйных залах ёсць таксама сюжэтныя фота камандавання партызанскай брыгады «Народныя мсціўцы», удзельнікаў мітынгу і парада, групы партызан на трафейнай нямецкай тэхніцы.

**Мікалай ШАЎЧЭНКА,**
*г. Мінск.*

Весткі з месцаў

# ХАРАСТВО ВЯСКОВЫХ РУЧНІКОЎ

**Вёска Корнадзь ад райцэнтра Свіслач адна з самых аддаленых, яна нібы схаваная ў лясах... Ды якіх жа багатых — на грыбы, ягады, лекавыя травы, жывёл.**



І людзі тут вельмі адметныя: шануюць свае карані, сваю спадчыну. Іх клопатам створаны і плённа працуе ўнікальны этнаграфічна-краязнаўчы музей, а нядаўна з'явілася адмысловае свята.

...Клубная ўстанова сустрэла нас квяцістымі ручнікамі мясцовых майстрых, яркасцю фарбаў і, здавалася, нават пахаў — настолькі натуральнымі выглядалі вышытыя васількі, рамонкі, ружы, бэз. Іх дэманстравалі тутэйшыя майстрыхі Таццяна Канстанцінаўна Трахімік і Алена Мікалаеўна Нехайчук.

Далей была экскурсія па залах музея ручніка, які напярэдадні атрымаў ганаровае званне «народны». Вучні распавядалі гасцям гісторыю яго стварэння, ролю гэтай рэчы ў штодзённым побыце, у беларускіх святах і абрадах. У прыватнасці, 25 гадоў таму, што называецца, сталі на ручнік, пачалі сваё сумеснае жыццё муж і жонка Лысевічы, 30 гадоў за плячыма ў сужэнцаў Лічыкаў, 40 гадоў поруч прайшлі Станіслаў Генрыхавіч і Яніна Антонаўна Болваны, Аляксей Васільевіч і Таццяна Міхайлаўна Здановічы, цягам 50 і радасць, і гора дзялілі Канстанцін Канстанцінавіч і Елізавета Сямёнаўна Пілюк, Аляксандр Аляксандравіч і Паліна Іосіфаўна Жалоба. 55 гадоў сумеснага жыцця ў Анатоля Адамавіча і Тамары Іванаўны Аўдашкаў.

Усіх вясельных юбіляраў на свяце віталі шчырымі апладысментамі, падарункамі і прыгожымі песнямі, якія, паводле Пімена Панчанкі, дышуць праўдай, вернасцю, пахнуць жытам, верасам — «і не заглушыць іх чысты звон».

Дзякуючы сумесным намаганням вучняў і настаўнікаў мясцовай школы, культработнікаў, старшыні Навадворскага сельскага Савета Ірыны Станіславаўны Якута і такіх актыўных жыхароў вёскі, свята атрымалася шчырым, прыгожым і, магчыма, нават традыцыйным.

**Марыя Самалевіч,**
*Свіслацкі раён.*

Што бачу

# ДАРМАЕДАМІ НЕ НАРАДЖАЮЦЦА... ІМІ СТАНОВЯЦЦА

**Тэма, якую хачу закрануць у сваім лісце, досыць неадназначная: многія са мной могуць не пагадзіцца... Але ж з'ява такая існуе, значыць, не трэба яе замоўчваць.**

У нашых людзей, жыхароў Беларусі, дабрыня, можна сказаць, у крыві: дапамога адно аднаму заўсёды была ў пашане. Людзі — і ў вёсках, і ў гарадах, наколькі ведаю, з павагай прымалі жабракоў, аднак жабрацтва бывае рознае.

Цяпер у гарадскіх дварах, асабліва побач з крамамі, часта тоўпяцца маладыя хлопцы, мужчыны. Яны як правіла не буяняць, не мацюкаюцца, проста нехта адзін можа адлучыцца ад кампаніі, падысці да прахожага, павітацца, нават папытаць пра справы і здароўе, а потым даверліва так папрасіць, каб выручыў — пазычыў рубель ці пяцьдзясят капеек.

З аднаго боку грошы не такія і вялікія, няёмка адмовіць, але ж і даць...

Да мяне вось днямі падышла дзяўчынка гадоў васьмі-дзевяці са словамі:

— Дзядзя, дай «денежку».

Прасіць аб гэтым такое мілае стварэнне, што рука проста міжволі цягнецца па грошы...

Праўда, у апошні момант штосьці насцярожвае: дзяўчынка хораша прыбраная, у вушах залатыя завушнічкі, на пазногціках — чырвоны лак, на ножках — модныя туфелькі.

— А навошта табе «денежка»? — пытаю ў яе.

— Ды катка пакарміць.

— Чужога, бяздомнага?

— Не, свайго.

— А чаму ты не папрасіла «денежку» ў таты з мамай?

— У іх няма.

— Ну, тады, — кажу, — можа, трэба самой зарабіць: здаць макулатуру, дапамагчы суседскім бабулям у кватэрах прыбраць, прадукты з крамы прынесці...

— Яшчэ чаго! — абураецца ў адказ дзяўчо, задзірае носік і, абазваўшы жміндай, кіруе да... іншага «дзядзі».

Што застаецца мне? Ды хіба ўспамінаць, што ў тыя ж восем-дзевяць гадоў грошай у мяне і равеснікаў таксама не было, а мець — хацелася, прычым вельмі! Каб зарабіць хоць нейкую капейку, мы, помню, збіралі пялёсткі васількоў і рамонкаў, пустыя бутэлькі, ягады і грыбы, хадзілі на работу ў калгас, адпасвалі радоўкі... Аднак на вуліцы ніколі нікога не пераймалі — не прасілі «денежку». Такое нават у галовы нам не прыходзіла, бо засмяялі б, прыляпілі б мянушку на ўсё жыццё.

У сённяшніх дзяцей, у моладзі ёсць бабулі і дзядулі таго самага савецкага выхавання, ёсць бацькі, дзіцячыя садкі, школы з прафесійнымі выхавацелямі і педагогамі, ёсць безліч разумных кніжак і ў той жа час — ну згадзіцеся — нейкія незнаёмыя, не нашы норавы. Ці не з іх пачынаецца дармаедства і вымагальніцтва, тэлефонныя і камп'ютарныя махлярствы, жаданне падмануць...

Суседка вось днямі пайшла на рынак. Ля ўвахода хлопчык папрасіў 50 капеек, сказаў, што не хапае на фрукты. Жанчына кажа:

— Пайшлі са мной, удвах нешта выберам і купім. Я цябе пачастую.

Ён у адказ:

— Ды пайшла ты... Сама свае фрукты еш! Грошы мне на электронныя цыгарэты патрэбныя.

Дзіця просіць... І нехта ж, напэўна, дасць?

Вось і думайце, як да такога ставіцца.

**Васіль Кабачэўскі,**
*г. Орша.*

Усмешачка

# АД НАС ЗАЛЕЖЫЦЬ ТОЛЬКІ ТЭРМІН?

**«Апошнім часам на вуліцах гарадоў і вёсак вельмі шмат заклапочаных людзей, — усмешлівых мала», — дзеліцца назіраннямі спадар Карповіч з Мінска. І таму прапануе чытачам жменьку сваіх смяшынак, дыялогаў і назіранняў — з надзеяй, што, прачытаўшы іх, хоць нехта ды ўсміхнецца.**

## Прызнанні

— Аня, каб ты толькі ведала, якая я дурная!

— Ды не хвалюйся... Пра гэта даўно ўсе ведаюць. Ты, шкада, пазнавата дазналася.

* * *

— Пятро, ты на якім фронце ваяваў?

— Дык я ж сто разоў казаў: на чацвёртым.

— А я, брат, на першым: і да ранення на першым, і пасля шпіталю... Ты, Пятро, не кіпяціся, я ж нічога такога не кажу: на чацвёртым таксама ваявалі... А я, брат, — на першым.

## Праўда і няпраўда

— Раман, гэта ты?

— Я...

— А чаму такі стары?

— Э... Э... Я ж не пытаюся, чаму ты такі дурны.

— Во, глядзі, пакрыўдзіўся, а я ж табе праўду сказаў.

* * *

— Вася? Ты?

— Я, брат, я.

— Ледзьве пазнаў! Колькі ж гадоў не бачыў... Як ты, дзе ты, кім працуеш?

— Начальнікам.

— Ты?! І кім жа кіруеш?

— Ды мне ўсё роўна: над кім паставяць, тымі і кірую.

— Гэта ж трэба!.. А ў класе апошнім вучнем быў.

— Няпраўда!.. Ну чаму ўсе кажуць «у класе»? Я тады ў школе апошнім быў.

## Высновы

Разумны чалавек сам сябе робіць шчаслівым, астатнія — чакаюць ад іншых.

* * *

У жыцці няма такога ўчынку, які б — на карысць дзіцяці — не апраўдала яго мама.

* * *

Калі чалавек маўклівы, кажуць, што ён разумны. Але ж як пра гэта даведацца, калі ён маўчыць?

* * *

У маладосці мы неяк не думаем, што цела нам дадзена ў карыстанне, прытым — часова. Ад нас толькі ў нейкай ступені залежыць тэрмін.

* * *

Пасля нараджэння адзінай непазбежнасцю з'яўляецца смерць, астатняе ўсё магчыма.

УНП 500826567

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**на 23.07.2024 в 11.00** по адресу: **230005, г. Гродно, ул. Максима Горького, 87, каб. № 204,** по продаже права заключения договора аренды недвижимого имущества сроком на **пять лет** для производственных целей (за исключением вредных производств), складских помещений, оказания услуг

Организатор аукциона – РУП «Белтелеком» в лице Гродненского филиала, 230005, г. Гродно, ул. Максима Горького, 87

| Адрес арендуемого имущества | № лота | Площадь, кв. м | Коэффициент от 0,5 до 3,0 | Начальная цена продажи, руб. | Размер задатка, руб. | Характеристика |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Капитальное строение, здание административное и складов, 2-й этаж, помещение. Гродненская обл., г. Гродно, ул. Карского, 12 | 1 | 10,10 | 3 | 44,84 | 44,84 | Помещение находится на втором этаже двухэтажного кирпичного здания, оштукатуренного и окрашенного. В здании имеется электроснабжение, автономное отопление, водоснабжение, канализация, телефонизация. Здание находится на расстоянии 3,9 км от автовокзала. К зданию организованы удобные подъездные пути. Площадь находится в удовлетворительном состоянии |

Порядок проведения и оформления участия в аукционе определены Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049 (в ред. постановлений Совмина от 21.06.2012 № 570, от 08.01.2013 № 16, от 12.07.2013 № 607).

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, в том числе индивидуальные предприниматели, предоставившие организатору следующие документы: представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет организатору аукциона оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица), документ, удостоверяющий личность, заявление на участие в аукционе, заявление об ознакомлении с документами, порядком проведения аукциона, соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, заверенную банком копию платежного документа, о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона, документ, удостоверяющий личность (для физических лиц, для представителей физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица), доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) (для представителей физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица), копию свидетельства о государственной регистрации (для индивидуальных предпринимателей и юридических лиц – резидентов Республики Беларусь), легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения (для юридических лиц – нерезидентов Республики Беларусь). Копии документов предоставляются без нотариального засвидетельствования.

*Задаток перечисляется на субсчет BY16AKBB30120000400714000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, БИК AKBB BY2X, Гродненский филиал РУП «Белтелеком».*

Участники аукциона уплачивают штраф в случаях, предусмотренных частью второй пункта 14 Положения о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049 (в ред. постановлений Совмина от 21.06.2012 № 570, от 08.01.2013 № 16, от 12.07.2013 № 607), в размере 15 % от начальной цены продажи соответствующего лота.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену за предмет аукциона. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на субсчет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение. Договор аренды по результатам аукциона заключается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола аукциона.

Прием документов на участие в аукционе осуществляется по адресу: 230005, г. Гродно, ул. Максима Горького, 87, каб. 407 **с 17.07.2024 по 22.07.2024 г. включительно** в рабочие дни (с 9.00 до 16.00). Документы, поданные после 16.00 22.07.2024 не рассматриваются.

**Телефоны для справок: (0152) 606805, (0152) 606804, (0152) 555138, факс (0152) 555139.**

## Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| Предметы аукциона | Начальная цена, руб. (без учета НДС) | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|
| **Лот № 1: легковой седан ФОЛЬКСВАГЕН ФАЭТОН, год выпуска 2008 г., регистрационный знак 0002 ВХ-1** | 25 600,00 | 1 280,00 |

**Продавец:** ОАО «Беловежский», 225078, Брестская обл., Каменецкий р-н, аг. Беловежский, ул. Ленина, 2, тел./факс 80163172888. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./факс 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** BY32BAPB30127866600100000000 в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901. **Условия продажи:** без условий. **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** в течение 5 рабочих дней с даты заключения договора купли-продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона

**Аукцион состоится 01 августа 2024 г. в 14.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона www.ocenkabrest.by, а также можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 31 июля 2024 г. до 17.00**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б, www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | ООО «Бизнес РМ», Могилевская обл., г. Кировск, ул. Кирова, 70, УНП 193626295 |
| **Предмет электронных торгов:** здание спасательного поста (здание специализированное иного назначения), инв. номер 600/С-72502, общей площадью 158,9 кв. м, по адресу: Минская обл., Минский р-н, Папернянский с/с, д. Семков Городок | **Начальная цена (с НДС 20 %) – 960 000,00 бел. руб.** |

**Сведения о земельном участке с кадастровым номером 623685510101000099:** предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания здания спасательного поста в районе д. Семков Городок общей площадью 0,0600 га

**Задаток 5 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: **www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **3 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 19.08.2024 г. с 11.00 до 13.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:**
заявки на участие в электронных торгах принимаются по **16.08.2024 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 (17) 373 21 33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор аукциона)
информирует о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего **государственному предприятию «ЭБ «Свекловичная»** на праве хозяйственного ведения **(Продавец)**

**Аукцион состоится 19.08.2024 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4.**

### Лот № 1: Легковой внедорожник универсал NISSAN X-TRAIL
**кузов (рама) № JN1TBNT30U0123085.**

**Начальная цена с НДС 20 %** – 5 160,00 руб.

### Лот № 2: Комбайн зерноуборочный самоходный КЗС-1218-10,
**заводской № 02631.**

**Начальная цена с НДС 20 %** – 35 520,00 руб.

**Место нахождения Лотов № 1, № 2:**
Минская обл, Несвижский район, аг. Ударный, ул. Боровая.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Государственного комитета по имуществу gki.gov.by и на электронной торговой площадке «GOSTORG» Организатора аукциона (gostorg.by).

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• gostorg.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

## Извещение о проведении **20 августа 2024 года** торгов на право размещения средства рекламы на недвижимом имуществе, принадлежащем РУП «Национальный аэропорт Минск»

| Место размещения средства рекламы (согласно схеме) | Вид средства рекламы | Размер рекламного поля, мм | Площадь рекламного поля, кв. м | Количество рекламных полей, ед. | Общая площадь, кв. м | Материал изготовления средства рекламы | Срок действия договора | Начальная цена предмета торгов/ сумма задатка, бел. руб. (с учетом НДС) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Помещение транспортного назначения № 1 в здании аэровокзального комплекса по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, тер. НАЦИОНАЛЬНОГО АЭРОПОРТА МИНСК, 19-1, Зона вылета E-F (колонна – 1 шт.) | Световые панели | 600 х 2 300 | 1,38 | 3 | 4,14 | Алюминиевые профили, акриловое стекло с матрицей, защитное оргстекло, по периметру конструкции светодиодная подсветка, обеспечивающая однородное подсвечивание всей конструкции | 3 года | 132,65* |

** При размещении рекламы игровых/игорных заведений (казино, казино-клубов, букмекерских контор, залов игровых автоматов), лотерей, рекламных игр и розыгрышей среди населения, связанных с получением денежных и иных призов, иностранных брендов, компаний/фирм – нерезидентов Республики Беларусь, товаров и услуг, производимых за пределами Республики Беларусь, применяется повышающий коэффициент 1,5*

**Государственное юридическое лицо** – республиканское унитарное предприятие «Национальный аэропорт Минск»», 220054, г. Минск, тер. Национальный аэропорт Минск, тел. (017) 279-25-62.

**Организатор торгов** – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», 220030, г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10, тел. (017) 360-42-22.

**Форма проведения торгов** – аукцион.

Торги проводятся в соответствии с Положением о порядке проведения торгов на право размещения средств рекламы на недвижимом имуществе, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 07.07.2021 № 395 «О мерах по реализации Закона Республики Беларусь «Об изменении законов по вопросам рекламы».

Аукционные торги проводятся **20 августа 2024 г. в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. Карла Маркса, 39, зал аукционов (каб. 7).

Документы на участие в торгах принимаются с 17.07.2024 **по 14.08.2024** включительно в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 6.

Документы, поданные по истечении указанного срока, не рассматриваются. Ответственность за достоверность сведений, указанных в документах, представленных для участия в торгах, несут лица, их подавшие.

**Порядок оформления участия в торгах:** к участию в аукционных торгах допускаются лица, прошедшие заключительную регистрацию, которые в срок, установленный для приема документов на участие в аукционных торгах, внесли задаток и заключили с организатором торгов соглашение установленной формы о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения торгов по соответствующему их предмету (далее – соглашение), а также представили организатору торгов следующие документы:

– заявление на участие в торгах;

– заверенную банком копию платежного документа о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет организатора торгов;

– копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, желающих принять участие в торгах.

Сумма задатка (сумма задатка соответствует начальной цене предмета торгов) должна быть внесена не позднее окончания срока и времени, установленных для приема документов, на расчетный счет организатора торгов BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, кодификатор назначения платежа 40901 (назначение платежа – задаток для участия 20.08.2024 в торгах на право размещения средства рекламы).

Участнику, не ставшему победителем торгов (лицом, приравненным к победителю торгов), внесенный задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

При подаче организатору торгов документов для участия в торгах и заключении соглашения представляются: физическим лицом, в том числе индивидуальным предпринимателем, – документ, удостоверяющий личность; представителем физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица – оригинал документа, подтверждающего его полномочия, и документ, удостоверяющий личность.

Лицу, допущенному к участию в аукционных торгах, организатор торгов выдает билет участника торгов, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано. Перед началом торгов организатор торгов проводит заключительную регистрацию лиц, допущенных к участию в торгах. Заключительная регистрация представляет собой замену билетов участников торгов на аукционные номера, под которыми участники торгов будут участвовать в торгах. После проведения торгов участники обязаны вернуть эти номера организатору торгов.

**Порядок определения победителя торгов:** торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Не допускается продажа предмета торгов по начальной цене. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается в соответствии с шагом аукциона, который определяется аукционистом в пределах от 5 до 15 процентов от предыдущей названной аукционистом цены. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов. Если заявление на участие в торгах подано только одним участником, либо для участия в нем явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, а такой участник признается лицом, приравненным к победителю торгов.

**Иные условия торгов:**

Победитель торгов (приравненное к нему лицо) обязан:

- **в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов** возместить государственному предприятию «МГЦН» затраты на организацию и проведение торгов, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для их проведения. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом торгов под подпись;

- **в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов** перечислить на расчетный счет РУП «Национальный аэропорт Минск» сумму средств, за которую продан предмет торгов за вычетом внесенной суммы задатка (цена продажи предмета торгов – стоимость услуг РУП «Национальный аэропорт Минск» по размещению рекламы, определенная по итогам торгов и уплачиваемая ежемесячно в соответствии с условиями торгов и договором возмездного оказания услуг о размещении (распространении) рекламы);

- **в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов** заключить договор возмездного оказания услуг о размещении (распространении) рекламы с РУП «Национальный аэропорт Минск» (при условии внесения платы за предмет торгов и возмещения организатору торгов расходов на их организацию и проведение).

Размер штрафа, уплачиваемого участником торгов и (или) его победителем (приравненным к нему лицом) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением, составляет 99 (девяносто девять) базовых величин на дату проведения торгов.

**Телефоны для справок:** отдел аукционов – (017) 360-42-22, РУП «Национальный аэропорт Минск» – (017) 279-25-62.

Извещение о проведении торгов размещено на сайтах: организатора торгов – **www.mgcn.by** (раздел «АУКЦИОНЫ/Рекламные конструкции»); РУП «Национальный аэропорт Минск» – **www.airport.by,** Минского городского исполнительного комитета – **www.minsk.gov.by** (раздел «Объявления – Аукционы»).

Псіхалогія для ўсіх

# НЕ АДКЛАДВАЙ НА ЗАЎТРА...

**У той ці іншай меры такія паводзіны знаёмыя кожнаму, і да пэўнага ўзроўню яны лічацца нормай. Прыходзячы на работу, мы, як правіла, не кідаемся неадкладна выконваць заданні начальства: спачатку пап'ём каву, залезем у сацсеткі ці пачытаем навіны. На мове навук гэта называецца «пракрастынацыя» (не блытаць з лянотай). На жаль, пазбавіцца ад яе раз і назаўжды нельга. Аднак пабароцца можна.**



— Пракрастынацыя — схільнасць да пастаяннага адкладвання нават важных і тэрміновых спраў, якая прыводзіць да жыццёвых праблем і балючых псіхалагічных наступстваў. Пракрастынацыя мае падабенства з вывучанай бездапаможнасцю — стан чалавека або жывёлы, у якім яны не прадпрымаюць спроб да яго паляпшэння (не спрабуюць пазбегнуць негатыўных стымулаў або атрымаць пазітыўныя), хоць маюць такую магчымасць, — расказвае **урач-псіхатэрапеўт Гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера Наталля ФАЦЕЕВА.** — Пракрастынацыя адрозніваецца ад ляноты тым, што ў выпадку ляноты суб'ект не хоча нічога рабіць і не турбуецца з гэтай нагоды, а ў стане пракрастынацыі ён усведамляе важнасць і тэрміновасць работы, але не робіць яе, магчыма, знаходзячы тыя ці іншыя самаапраўданні. І калі для адпачынку характэрна папаўненне сіл, то на пракрастынацыю неабходна затрачваць энергію.

Гэтая з'ява вядома даўно і знаходзіць апісанне ў прыказках: «Не адкладай работу на суботу, а жаніцьбу — на старасць», «Нам бы так араць, каб мазалёў не набіваць», «Пакуль гром не грымне — мужык не перахрысціцца», «Не адкладай на заўтра тое, што можна зрабіць сёння».

Існуе мноства тэорый, якія спрабуюць растлумачыць дадзеную з'яву, але ні адна з іх не з'яўляецца агульнапрызнанай і ўніверсальнай. Сярод іх псіхатэрапеўт называе нізкую самаацэнку, перфекцыянізм, самаабмежаванне, непакорлівасць (дух супярэчнасці), тэорыю часовай матывацыі. Найбольш абгрунтаванай лічыцца тэорыя часовай матывацыі.

Паводле яе, суб'ектыўная карыснасць дзеяння, якая і вызначае жаданне чалавека яго здзейсніць, залежыць ад чатырох параметраў: упэўненасці ў поспеху, каштоўнасці, гэта значыць меркаванай узнагароды, тэрміну да завяршэння работ, узроўню нецярпення, гэта значыць адчувальнасці да затрымак.

— Чалавек лічыць больш карыснай справу, калі ўпэўнены ў яе ўдалым завяршэнні і чакае па ёе выніках вялікай узнагароды. Наадварот, суб'ектыўна менш карыснымі падаюцца справы, да завяршэння якіх засталося яшчэ шмат часу. Акрамя таго, чым больш балюча мы пераносім затрымкі, тым менш карыснымі нам здаюцца справы, на завяршэнне якіх патрабуецца некаторы час. Іншымі словамі, найлепшым чынам работа выконваецца тады, калі да яе маюцца высокія чаканні і асабістая зацікаўленасць, а час дасягнення зведзены да мінімуму, — тлумачыць Наталля Фацеева.

Калі пракрастынацыя напрамую залежыць ад ступені матывацыі (цікавасці да працы і пазітыўных чаканняў ад яе завяршэння), у некаторых выпадках вырашыць праблему можна, змяніўшы работу (кінуўшы вучобу), але ёсць верагоднасць, што такі шлях прывядзе да таго, што на новым месцы з'явяцца тыя ж самыя праблемы.

— Нейкага вызначанага рэцэпта, які меркаваў бы збаўленне ад пракрастынацыі, няма і быць не можа, — гэта ў нейкай ступені пастаянная барацьба з самім сабой, — кажа ўрач.

Аднак ёсць методыкі «кіравання часам», якія ў той ці іншай ступені дазваляюць знізіць узровень пракрастынацыі і павысіць рэальную аддачу ад працы, што цягне за сабой павышэнне задаволенасці ад жыцця і збавенне ад стрэсу.

Звычайна не ўзнікае асаблівых праблем з пракрастынацыяй у людзей, якія для сябе могуць правесці рысу, недвухсэнсоўна падзяляючы справы на тэрміновыя і тыя, выкананне якіх можа пачакаць. Такім чынам, вылучаецца ўсяго чатыры катэгорыі спраў, на якія сыходзіць час: важныя і нетэрміновыя; важныя і тэрміновыя (сюды ўваходзяць усе сапраўды неадкладныя справы: аварыйная сітуацыя, хвароба, крайні тэрмін, сямейны крызіс, пагроза жыццю); няважныя і тэрміновыя (гэта ўсякія нібы неадкладныя, але ў рэчаіснасці яны не ўплываюць на жыццё: суседзі запрасілі, 52-годдзе цешчы, штодзённыя гутаркі падчас абеду, штодзённая прыборка дома); няважныя і нетэрміновыя.

Акрамя таго, неабходна планіраваць свой дзень і выдзяляць час на кожную работу з улікам адпачынку, магчымых затрымак і гэтак далей. Замест паслядоўнага выканання задач, калі нельга прыступіць да пачатку наступнай, пакуль не скончыш папярэднюю, адначасова выконвайце некалькі розных задач — па частках.

Правільна размяркуйце намаганні: на Усходзе прынята лічыць справы, якія плануюцца і не выконваюцца, «непасільнай ношай». Энергія марнуецца, калі мы не здзяйсняем тое, што запланавалі, і працягваем планаваць тое, чаго ніколі не ажыццявім. Пачуццё віны з'ядае нашы ўнутраныя энергетычныя рэзервы. Чым больш застаецца незавершаных спраў, тым менш сіл на тое, каб іх завяршыць.

Сутнасць гэтай тэхнікі можна выказаць наступнымі словамі: не плануй наперад, калі ёсць нясконачаныя справы.

Кіраванне мэтамі неабходна для таго, каб пры выкананні любога дзеяння чалавек хоць бы аддалена, у перспектыве, уяўляў, для чаго (у маштабах усяго яго жыцця) гэта робіцца і на што ўплывае. Такім чынам мы вучымся разумець, чаго хочам, чаго дабіваемся, што трэба для гэтага зрабіць, кожнае дзеянне напаўняецца для нас канкрэтным асабістым сэнсам, у выніку радзей адкладваем па-сапраўднаму важныя справы.

Скажыце, доктар...

# ХВАРОБА АПЛЯВУХ

## Што гэта такое і чаго асцерагацца?

**У многіх дзяцей яна так і застаецца нераспазнанай. Памылкі часам дапускаюць нават дасведчаныя ўрачы. Нярэдка сып прымаюць за алергію і лечаць ад яе. Калі блытаюць яе з краснухай або адром, дзіця трымаюць на каранціне, а потым у медыцынскай карце з'яўляецца запіс аб нібы перанесеным захворванні, якім ён не хварэў. Натуральна, лічыцца, што сфарміраваўся да яго імунітэт. А насамрэч нічога не было. Асабліва гэта дрэнна ў дачыненні да краснухі, з якой дадзеную інфекцыю часта блытаюць. Бо жанчыны, якія не хварэлі на яе, павінны быць асабліва асцярожныя падчас цяжарнасці — краснуха проста фатальная для плоду.**



Хвароба яшчэ дрэнна вывучаная, нягледзячы на тое, што ўпершыню апісана ў канцы XIX стагоддзя, тады яе называлі мясцовай краснухай. А калі 40 гадоў таму адкрылі яе ўзбуджальніка, то сталі называць парвавіруснай інфекцыяй. Сустракаецца яна дастаткова часта, бо даследаванні паказваюць, што не менш чым палова дарослых людзей выпрацавалі супраць яе імунітэт. Што гэта за хвароба і ў чым яе небяспека, разбіраемся з **урачом-інфекцыяністам 22-й гарадской дзіцячай паліклінікі Дар'яй ПЕТРАЧУК.**

— Калі дзіця прыйшло дадому з вуліцы пасля актыўнага адпачынку, бацькі могуць заўважыць на шчоках чырвань, у некаторых выпадках нават можа падняцца невялікая тэмпература. Звычайна агульны стан дзіцяці мяняецца не істотна, і блізкія расцэньваюць, што гэта праява алергіі на нейкі з'едзены прадукт, або чырвань трымаецца ад перагрэву на сонцы. Але праз пару дзён, калі «алергія» са шчок пераходзіць на канечнасці і стандартныя супрацьалергічныя прэпараты не дапамагаюць, з'яўляецца неабходнасць звярнуцца да ўрача. У некаторых выпадках візіт абумоўлены з'яўленнем падобнай «алергіі» на працягу тыдня ў іншых членаў сям'і, і з'яўляюцца сумненні, што гэта проста алергія.

Насамрэч такія сімптомы клінічныя праявы інфекцыйнай эрытэмы (яна ж пятая хвароба, яна ж парвавірус B19, яна ж «хвароба аплявух»). Пятай хваробай яна названа, бо адносіцца да шасці класічных дзіцячых захворванняў, якія суправаджаюцца сыпам: першая хвароба — адзёр, другая — шкарлятына, трэцяя — краснуха, чацвёртая — інфекцыйны монануклеёз, пятая — інфекцыйная эрытэма, шостая — дзіцячая разеола (раптоўная экзантэма).

***— Калі яе не распазнаць, дзіця можа і не атрымаць належнага лячэння...***

— У большасці дзяцей парвавірусная інфекцыя працякае лёгка і не патрабуе асаблівага лячэння.

***— Як адбываецца заражэнне?***

— Крыніца інфекцыі — хворы чалавек. Для яе характэрна сезоннасць (пачатак красавіка — канец чэрвеня). Прадрамальныя з'явы (прадвесніі захворвання) у большасці выпадкаў адсутнічаюць або праяўляюцца лёгкімі грыпападобнымі (ліхаманка, агульнае нядужанне, боль у горле, галаўны боль, насмарк) і гастраінтэстынальнымі (умераная млоснасць, дыярэя) сімптомамі. Гэта пачатак вірэміі, калі вірус цыркулюе ў крыві і дзіця максімальна заразнае для навакольных.

Праз 2-3 дні агульны стан нармалізуецца і з'яўляецца сімптом «слядоў ад аплявух» — сіметрычны ярка-чырвоны сып на абедзвюх шчоках, які на працягу некалькіх гадзін зліваецца, утвараючы адну эрытэму (пачырваненне скуры). Сып не закранае пераносся і вобласць вакол рота. Знікае звычайна праз чатыры дні. Пры гэтым заразнасць падае ў некалькі разоў. Прыкладна праз двое сутак ад з'яўлення сыпу на твары бачны ажурны сып на канечнасцях, тулаве, ягадзіцах. Сып можа суправаджацца свербам, а знікае прыкладна праз 7—14 дзён. Сустракаецца і рэцыдывавальны працяг, калі сып то з'яўляецца, то знікае на працягу месяца. Такі стан можа быць справакаваны змяненнем тэмпературы надвор'я, эмацыянальнымі расстройствамі або сонечным святлом.

